ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 41 (1004) | Субота, 9 кастрычніка 1954 года | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМА

Першая старонка.

Перадавы. — Новы канцэртны сезон.

Рэзалюцыя Трэцяга з'езда совецкіх пісьменнікаў БССР.

Другая старонка.

А. Бутакоў. — Спектакль без чэхаўскай паэзіі.

Э. Агняцвет. — Выдатны украінскі паэт.

А. Музыкін. — Мастацкім калектывам — дзейсную творчую дапамогу.

Ус. Раждзест
Б. Смольскі.
отэрства.

М. Садковіч.
ВЕРШЫ НЯ
Песня пра бла
салдаты! Куба.
ным шляху.
У Германска

Новы канцэртны сезон

У сталіцы Беларусі пачаўся асенне-зімовы канцэртны сезон. Ён адкрыўся выступленнямі цікавага ансамбля песні і танца Бурат-Мангольскай АССР, гастрольнымі канцэртамі вядомых піяністаў і скрыпачоў Эміля Гілельса і Ігара Бязроднага.

Гэтымі канцэртамі філармонія працягвае сваю вельмі добрую традыцыю: яна сістэматычна запрашае на гастролі вядомых майстроў музычнага і вакальнага мастацтва. Так, у мінулым сезоне ў Мінску адбыліся гастрольныя канцэрты Хачатурана, Ойстраха, Гаспаран і іншых.

Слухачы сталіцы з вялікай цікавасцю наведвалі і наведваюць такія канцэрты і заўсёды застаюцца задаволенымі выступленнямі майстроў мастацтва.

З рознастайнай праграмай выступіў аркестр філармоніі; калектывы філармоніі і эстрады далі свае першыя канцэрты ў рабочых клубах і сельскіх дамах культуры.

Аднак творчыя і арганізацыйныя вынікі работы канцэртных устаноў за мінулы сезон абавязваюць гаварыць аб карэнным палепшанні музычнай прапаганды, а таксама выканаўчай культуры ансамбляў, салістаў і майстроў мастацкага слова.

Многа слушных прэтэнзій было ў адрас сімфанічнага аркестра філармоніі. Ці можна сцвярджаць, што падставы для гэтых прэтэнзій ужо цалкам зніклі? На жаль, не. Вядома, што аркестр слаба творча расце, слаба папаўняецца маладымі таленавітымі артыстамі, мае патрэбу ў пастаяннай выхаваўчай рабоце дырыжора-педагога.

Няма належнай культурна-асветнай работы перад сімфанічнымі канцэртамі, не вывучаецца вопыт Маскоўскай і асабліва Ленінградскай філармоній па ўмацаванню сувязей са сваімі слухачамі. Толькі ўпершыню ў гэтым сезоне выдадзена праграма са зместам (на жаль, празмерна агульным і кароткім) сімфоній, якія выконваліся ў верасні ў Акруговым Доме афіцэраў. Не забяспечана яшчэ кансультацыя музыказнаўцаў, няма кіёска з папулярнай літаратурай аб сімфанічных творах, вітрыны пытанняў слухачоў і адказаў кваліфікаваных музыкантаў. Рэдка можна пачуць жывое, вобразнае ўступнае слова перад выкананнем складанай праграмы.

Да гэтага часу ў Мінску не наладжаны продаж абанементаў на асобныя сімфанічныя цыклы. Дырэкцыя філармоніі праяўляе недаравальную абыякавасць да ўсяго таго, што можа павысіць цікавасць слухачоў да музычнай творчасці. Вельмі абмежаваны рэпертуар аркестра. Даўно ўжо ім не выконваліся сімфоніі Мяскоўскага, Пракоф'ева, Шастаковіча, Гліэра. Асабліва рэдка можна паслухаць творы кампазітараў Закаўказзя, Сярэдняй Азіі, Прыбалтыкі і іншых брацкіх рэспублік.

У Маскве, Ленінградзе і Кіеве значнай папулярнасцю карыстаецца канцэртнае выкананне опер, якія не ідуць на сцэне. Філармонія павінна была-б скарыстаць для гэтай мэты свой аркестр, салістаў оперы, выкладчыкаў і студэнтаў старшых курсаў кансерваторыі. З вялікай цікавасцю праслухалі-б мінчане ў канцэртным выкананні «Фідэліё» Бетховена, «Эрнані» Вердзі і іншыя класічныя оперы, якія да гэтага часу яшчэ не ўбачылі ў нас святла рампы. Нарэшце, можна часцей уключаць у канцэрты сцэны і арыі з беларускіх опер, урыўкі з твораў Даргамыжскага, Танеева, Рубінштэйна і іншыя.

Патрэбна арганізаваць для студэнцкай і рабочай моладзі аўтарскія канцэрты беларускіх кампазітараў Чуркіна, Цікоцкага, Залатарова, Алоўнікава з уступным словам кампазітараў аб сваёй творчасці.

Філармонія ў апошні час чамусьці страціла густ да арганізацыі камерных канцэртаў. Даўно не выступаў з адкрытай эстрады струнны квартэт, ужо не існуе вакальны ансамбль, няма каму выконваць камерныя творы беларускіх кампазітараў, заахвочваць іх работу ў гэтай галіне.

Вельмі дзіўна, што Дзяржаўны народны хор, які часта і з вялікім поспехам выступае ў Маскве, даволі рэдкі госць на мінскай канцэртнай эстрадзе. Такое-ж становішча і з аркестрам народных інструментаў.

Белдзяржэстрада ўсё яшчэ ўхіляецца ад арганізацыі адкрытых канцэртаў сваіх пастаянных штатных брыгад і салістаў у Мінску. Прычына тэтага ў тым, што яе калектывы не могуць парадаваць мінчан яркай і рознастайнай праграмай, новымі змястоўнымі творамі, высокім выканаўчым майстэрствам, свежымі, маладымі галасамі.

Калі на афішах філармоніі часам яшчэ з'яўляюцца новыя імёны, дык эстрада гэтым ніяк не можа пахваліцца. Нават вакальны дуэт Александровіч і Лісненўскай, які ў нядаўнім мінулым быў у творчым актыве Белдзяржэстрады, за апошні час змоўк. Замест клопатаў аб прыцягненні маладых сіл кіраўніцтва Белдзяржэстрады ўсё яшчэ пятурае антымастацкім калектывам накшталт так званага ансамбля аперэты і выпадковым «дзікім» гастралёрам.

Нашы канцэртныя арганізацыі ўсё яшчэ не праяўляюць сапраўднай прыхільнасці да мастацкага слова, да выхавання майстроў гэтага жанра. Бедны і рэпертуар артыстаў, якія выступаюць з чытаннем твораў совецкіх паэтаў. З усяго багацця паэтычнай творчасці А. Куляшова брыгады Белдзяржэстрады выконваюць толькі яго асобныя вершы. Вельмі рэдка можна пачуць у канцэртах паэтычнае слова класікаў беларускай паэзіі, паэмы і вершы сучасных паэтаў П. Броўкі, М. Танка, П. Панчанкі, П. Глебкі, сатыру К. Крапівы, Ул. Корбана.

Слухачы музыкі і песні, аматары танца маюць сваіх любімых артыстаў старэйшага і малодшага пакалення і хацелі-б пачуць і ўбачыць іх з эстрады ў індывідуальных канцэртах — творчых справаздачах.

Кансерваторыя перыядычна наладжвае канцэрты сваіх выкладчыкаў і студэнтаў. Гэта вельмі прыемная з'ява. Але шкада, што выступленні дрэнна рэкламуюцца і аб іх не паведамляецца ў друку.

Не ў пашане ў нашых музычных установах канцэрты для дзяцей. А між тым, для юных слухачоў трэба асабліва ўважліва падбіраць праграмы, клапаціцца аб творчай культуры і добрым густе іх выканаўцаў.

Цікавей і ярчэй трэба праводзіць лекцыі-канцэрты. Нельга дапускаць таго, каб у якасці лектараў выступалі дылетанты. Недаравальна, калі ў ролі ілюстратараў лекцый выступаюць безгалосыя спевакі і няўдалыя піяністы, якія чамусьці карыстаюцца ўвагай філармоніі або Таварыства па распаўсюджанню палітычных і навуковых ведаў.

Многа чакае совецкі слухач у новым канцэртным сезоне. Задаволіць усе яго запатрабаванні да музыкі, песні і мастацкага слова — важнейшы абавязак філармоніі, Белдзяржэстрады і дзяржаўных музычных калектываў.

Заключны спектакль Дзяржаўнага Польскага тэатра ў Маскве

6 кастрычніка Дзяржаўны Польскі тэатр, які выступае ў Маскве, даў заключны спектакль. Зала была перапоўнена гледачамі, якія з вялікай цеплынёй сустракалі артыстаў. Ішла п'еса таленавітага сучаснага польскага драматурга Е. Юрандота «Такія часы» ў пастаноўцы М. Выжыкоўскага. Спалучэнне прастаты і высокага акцёрскага майстэрства, якое складае каштоўнейшую якасць польскага тэатральнага мастацтва, асабліва вызначае пастаноўку гэтай сатырычнай камедыі. У цэнтры п'есы — дырэктар завода ў маленькім польскім гарадку, які марыць разам са сваёй жонкай аб сталічным жыцці. Увагу публікі прыцягнула выкананне артыстам Т. Кондрат ролі дырэктара. У вострым гратэскавым плане іграла Б. Людвіжанка (жонка дырэктара). Прастатой, мяккім гумарам вызначалася выкананне Ч. Валэйкам ролі пісьменніка Скупені. Акцёры К. Мараўскі, К. Каркоўская, М. Лонч, Ф. Хмуркоўскі стварылі вобразы, поўныя жыццёвай праўды, насычаныя народным гумарам. Спектакль у яркай камедыйнай форме выкрывае жывучы перажытак мінулага—мяшчанства.

Спектакль атрымаў высокую ацэнку гледачоў. Пасля заканчэння спектакля народны артыст СССР В. О. Тапаркоў ад імя тэатральнай грамадскасці Масквы вітаў артыстаў Польскага тэатра і павіншаваў іх з выдатным поспехам. У адказ з прамовай выступіў мастацкі кіраўнік Польскага тэатра Браніслаў Дамброўскі.

На заключным спектаклі Дзяржаўнага Польскага тэатра прысутнічалі К. Е. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, Г. М. Маленкоў, М. З. Сабураў, М. А. Суслаў, Н. Н. Шаталін, А. Н. Касыгін, І. Ф. Тэвасян, міністры СССР, дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, дзеячы совецкай навукі і культуры.

На спектаклі прысутнічаў таксама Надзвычайны і Поўнамоцны Пасол Польскай Народнай Рэспублікі ў СССР В. Левікоўскі.

(ТАСС).

Рэзалюцыя Трэцяга з'езда совецкіх пісьменнікаў БССР

Беларуская літаратура ў выніку няспынных клопатаў Комуністычнай партыі стала адным з перадавых атрадаў многанацыянальнай совецкай літаратуры. Адлюстроўваючы гераічныя будні народа, пісьменнікі Совецкай Беларусі заўсёды мастацкім словам дапамагалі партыі і народу ў вырашэнні велічных задач пабудовы комуністычнага грамадства. За перыяд паміж другім і трэцім з'ездамі пісьменнікаў БССР Сталінскімі прэміямі адзначаны лепшыя творы беларускай літаратуры — зборнік вершаў «Дарога жыцця» П. Броўкі, раман «Глыбокая плынь» І. Шамякіна, аповесць «У Забалоцці днее» Я. Брыля, п'еса «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы і кніга «Янка Купала» Я. Мазалькова.

Асновай стварэння высокаідэйных і высокамастацкіх твораў беларускай совецкай літаратуры з'яўляўся і з'яўляецца творчы метад соцыялістычнага рэалізма.

Беларускія совецкія пісьменнікі ў сваёй творчасці кіруюцца гістарычнымі рашэннямі XIX з'езда КПСС. Гэты з'езд паставіў перад совецкай літаратурай баявую праграму стварэння твораў, вартых гераічных подзвігаў нашага народа, праграму рашучай барацьбы супраць усякіх скажэнняў рэчаіснасці.

Мы ведаем, якую шкоду совецкай літаратуры прынесла асуджаная партыяй так званая тэорыя «бесканфліктнасці», якая нацэльвала пісьменнікаў на згладжванне супярэчнасцей у нашым грамадстве, на паказ з'яў і людзей толькі ў ружовых фарбах. Разам з тым наша партыя і совецкая грамадскасць рэзка асудзілі шкодныя артыкулы некаторых крытыкаў і пісьменнікаў, якія пад фальшывым сцягам «шчырасці» ў літаратуры імкнуліся накіраваць увагу літаратараў толькі на паказ адмоўнага ў нашым жыцці.

Народ чакае ад совецкіх пісьменнікаў такіх твораў, якія-б ярка і праўдзіва адлюстроўвалі нашу рэчаіснасць, наша багатае падзеямі жыццё і дапамагалі народу ў яго пачэснай справе будаўніцтва комунізма.

За пяць год, якія мінулі з часу другога з'езда пісьменнікаў БССР, у беларускай літаратуры знайшлі сваё адлюстраванне тэмы калгаснага будаўніцтва, жыцця рабочага класа, дружбы народаў, барацьбы за трывалы мір паміж народамі свету. Далейшую распрацоўку ў новых творах знайшла тэма Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху ў Беларусі. Беларуская совецкая літаратура ўзбагацілася таксама творамі, у якіх паказана рэвалюцыйная барацьба працоўных Беларусі і слаўнае мінулае нашага народа. Буйным укладам у скарбніцу беларускай літаратуры гэтых год з'яўляецца закончаная народным паэтам БССР Якубам Коласам заключная частка палескай трылогіі — аповесць «На ростанях». Нашымі празаікамі за гэтыя гады напісаны такія творы, як раман-эпапея М. Лынькова «Векапомныя дні», гісторыка-рэвалюцыйны раман П. Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах», раманы аб калгасным жыцці — «Святло над Ліпскам» М. Паслядовіча, «У добры час» І. Шамякіна, аповесць Я. Брыля «У Забалоцці днее», раман аб гераізме совецкіх людзей у час Вялікай Айчыннай вайны — «Мінскі напрамак» І. Мележа, раманы «У агні» І. Гурскага, «Згуртаванасць» М. Ткачова.

З новымі здабыткамі прыйшла да трэцяга з'езда беларуская паэзія. За апошняе пяцігоддзе з'явіліся такія паэмы, як «Граніца», «Толькі ўперад» А. Куляшова, «Добры друг» П. Броўкі, «Дзённік міру» М. Танка, «Аповесць пра залатое дно» А. Зарыцкага. Пашырылася тэматыка вершаў, у якіх ахопліваюцца рознастайныя з'явы жыцця і пачуцці совецкага чалавека.

Пэўныя зрухі адбыліся ў гэтыя гады ў развіцці беларускай драматургіі. Шырокім поспехам у гледача карыстаюцца п'есы «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка, «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча.

З'езд адзначае некаторыя поспехі ў крытыцы і літаратуразнаўстве. Групай літаратуразнаўцаў створаны падручнікі па беларускай літаратуры для вышэйшых навучальных устаноў і нарыс гісторыі беларускай совецкай літаратуры. За гэты час выйшаў рад зборнікаў крытычных прац і манаграфій пра творчасць асобных пісьменнікаў. Напісана кніга па гісторыі беларускага тэатра.

Пісьменніцкая арганізацыя Беларусі ў гэтыя гады працягвала расці за лік таленавітай моладзі — у Саюз пісьменнікаў прынята 27 новых членаў і кандыдатаў.

Адзначаючы пэўныя дасягненні беларускай літаратуры за апошнія гады, XXI з'езд КПБ звярнуў асаблівую ўвагу Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР на адставанне раду жанраў, асабліва драматургіі і дзіцячай літаратуры, і паставіў перад беларускімі літаратарамі задачу далейшага павышэння ідэйна-мастацкай якасці твораў, глыбейшага і ўсебаковага адлюстравання нашай рэчаіснасці.

З адчуваннем усёй адказнасці за гэтыя недахопы трэці з'езд пісьменнікаў Совецкай Беларусі адзначае, што пісьменнікі рэспублікі павінны больш шырока паказваць у сваіх творах тыя пераўтварэнні, якія адбыліся і адбываюцца ў калгаснай вёсцы ў выніку ажыццяўлення рашэнняў партыі аб крутым уздыме соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, што ў беларускай літаратуры вельмі слаба распрацоўваецца тэма самаадданай працы рабочага класа. Пісьменнікі не стварылі яшчэ яркіх вобразаў рабочых, вобразаў, якія зрабіліся-б узорам пераймання для нашай моладзі.

Празаікі і паэты надзвычайна мала пішуць апавяданняў, вершаў, нарысаў на надзённыя тэмы, часта на старонкі перыядычнага друку трапляюць слабыя і недапрацаваныя творы, якія павярхоўна і прымітыўна малююць наша сучаснае жыццё.

Юнага чытача не задавальняе сённяшні стан дзіцячай літаратуры. У нас мала кніг на навукова-папулярныя тэмы, кніг аб піонерах і школьніках, аб родным краі, цікавых падарожжах. Амаль няма твораў для самых маленькіх — для дашкольнікаў.

Да гэтага часу ў рэспубліцы ўсё яшчэ адстае драматургія. У нашых тэатрах мала новых п'ес беларускіх пісьменнікаў, вельмі мала пішацца п'ес для мастацкай самадзейнасці. Мала ў нас сцэнарыяў, па якіх можна было-б ставіць арыгінальныя кінокарціны.

Крытыкі і літаратуразнаўцы нездавальняюча распрацоўваюць праблемы развіцця сучаснай беларускай совецкай літаратуры. Мала друкуецца праблемных артыкулаў. Аўтары манаграфічных работ часта разглядаюць творчасць пісьменнікаў у адрыве ад агульнага літаратурнага працэсу.

Прэзідыум праўлення ССП недастаткова займаўся творчымі пытаннямі, аддаючы перавагу пытанням арганізацыйным. Не было дастатковага кіраўніцтва з боку прэзідыума секцыямі Саюза. Секцыі пакуль не сталі творчымі лабараторыямі пісьменнікаў, абмеркаванне твораў на іх пасяджэннях часта праходзіла фармальна, у іх рабоце мала ўдзельнічаюць старэйшыя пісьменнікі.

Не наладжана ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР прапаганда беларускай совецкай літаратуры. Да гэтага часу не створана бюро прапаганды, літаратурныя вечары арганізоўваюцца стыхійна, без усякага плана і ўліку заўваг і пажаданняў чытачоў.

Творчыя секцыі і праўленне ССПБ слаба звязаны з іншымі творчымі арганізацыямі — тэатрамі, эстрадай, філармоніяй, Саюзам кампазітараў і Саюзам мастакоў, таму паміж пісьменнікамі і работнікамі мастацтва няма сапраўднага творчага кантакту.

Недастаткова аператыўна і канкрэтна праўленне ССПБ накіроўвала і кантралявала работу рэдкалегій сваіх друкаваных органаў.

Разумеючы ўсю важнасць тых велізарных задач, якія стаяць перад беларускай совецкай літаратурай, і зыходзячы з пагрэбаванняў, якія высоўвае перад беларускімі пісьменнікамі партыя і народ, трэці з'езд совецкіх пісьменнікаў Беларусі заклікае ўсіх літаратараў рэспублікі і надалей актыўна змагацца за ўздым ідэйна-мастацкай якасці сваёй творчасці, за актыўнае ўтаржэнне ў нашу рэчаіснасць. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на шырокае адлюстраванне тых велізарных змен, якія адбыліся ў жыцці рабочага класа, калгаснага сялянства і совецкай інтэлігенцыі рэспублікі.

Побач з глыбокім вывучэннем жыцця пісьменнік павінен няспынна ўзбройвацца тэарэтычна, авалодваючы марксізмам-ленінізмам, настойліва засвойваючы прынцыпы соцыялістычнай эстэтыкі. Творчая работа пісьменнікаў павінна знаходзіцца пад знакам шырокага разгортвання прынцыповай крытыкі і самакрытыкі, барацьбы з варожымі праявамі ў літаратуры, з рэшткамі буржуазнай ідэалогіі.

Асаблівую ўвагу пісьменнікаў з'езд звяртае на неабходнасць больш актыўнай і шырокай распрацоўкі надзённых пытанняў сучаснага жыцця, якія хвалююць наша грамадства. Пісьменнікі павінны штодзённа дапамагаць сваім мастацкім словам ажыццяўленню задач, пастаўленых перад народам у гістарычных рашэннях партыі і ўрада.

Адной з важнейшых задач беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца задача далейшага няспыннага авалодвання прафесійным майстэрствам, задача барацьбы за ўзбагачэнне, чысціню і вобразнасць літаратурнай мовы.

Неабходна ў далейшым мацаваць і пашыраць ідэйна-творчыя сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі брацкіх народаў СССР і краін народнай дэмакратыі. З'езд лічыць неабходным значна павялічыць колькасць перакладаў з моваў брацкіх народаў СССР і краін народнай дэмакратыі.

З'езд абавязвае праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР рашуча палепшыць работу па выхаванню маладых пісьменнікаў — узмацніць кіраўніцтва літаратурнымі аб'еднаннямі, часцей і больш шырока абмяркоўваць творы літаратурнай моладзі, дбайна сочачы за яе творчым ростам, дапамагаць у хутчэйшым выданні лепшых твораў маладых пісьменнікаў.

Праўленне ССПБ разам з кіраўнікамі творчых секцый павінна знаходзіць і заахвочваць самыя рознастайныя формы работы, каб секцыі з'яўляліся сапраўднымі творчымі лабараторыямі і калектыўнымі дарадчыкамі ў рабоце пісьменнікаў. Неабходна ўзмацніць калектыўную адказнасць пісьменнікаў за творы, якія абмяркоўваюцца на секцыях і з'яўляюцца ў друку.

З'езд патрабуе ад праўлення ССПБ узняць арганізуючую ролю перыядычных выданняў Саюза. Часопісы «Полымя», «Беларусь», альманах «Совєтская Отчизна», газета «Літаратура і мастацтва» павінны актыўна садзейнічаць развіццю шырокай прынцыповай крытыкі і самакрытыкі, разгортванню свабодных творчых дыскусій па важнейшых літаратурных праблемах, па пытаннях майстэрства.

Пісьменнікі Совецкай Беларусі запэўняюць родную Комуністычную партыю і народ, што яны прыкладуць усе сілы, каб выканаць адказныя і пачэсныя задачы, пастаўленыя перад совецкай літаратурай.

Выстаўка, прысвечаная беларускай літаратуры

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя В. І. Леніна адкрыта вялікая выстаўка «Беларуская літаратура за дваццаць год» (1934—1954 гг.).

На выстаўцы шырока прадстаўлены творы В. І. Леніна і І. В. Сталіна, прысвечаныя пытанням літаратуры. Экспануюцца таксама даклад А. А. Жданава на першым з'ездзе пісьменнікаў СССР «Совецкая літаратура — самая ідэйная, самая перадавая літаратура ў свеце», зборнік артыкулаў і прамоў М. І. Калініна «Аб літаратуры» і іншыя матэрыялы.

Асобныя стэнды прысвечаны творчасці народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Наведвальнікі выстаўкі маюць магчымасць пазнаёміцца з першымі выданнямі твораў народных паэтаў, з фотаматэрыяламі, якія расказваюць аб дружбе і творчых сувязях беларускіх пісьменнікаў з рускімі пісьменнікамі і пісьменнікамі другіх брацкіх рэспублік.

Сярод экспанатаў выстаўкі — фотарэпрадукцыя рукапіса верша Максіма Рыльскага «Янка Купала», здымак 1940 года — Я. Колас, Я. Купала і А. Талстой. На адным са здымкаў адлюстраваны момант уручэння М. І. Калініным ордэна Чырвонага Сцяга Я. Коласу 26 лістапада 1943 года.

На шматлікіх стэндах — кнігі А. Куляшова, П. Броўкі, М. Танка, П. Глебкі, П. Панчанкі, К. Чорнага, М. Лынькова, З. Бядулі, Эд. Самуйлёнка, М. Паслядовіча, І. Гурскага, І. Грамовіча і іншых пісьменнікаў.

Багата прадстаўлены творы беларускай літаратуры ў перакладах на мовы народаў СССР: рускую, украінскую, латышскую, літоўскую, узбекскую, грузінскую.

Асабліва вялікую цікавасць уяўляе раздзел, прысвечаны выданням беларускіх пісьменнікаў у краінах народнай дэмакратыі. Сярод экспанатаў гэтага раздзела — польскія пераклады «У палескай глушы» Я. Коласа, апавяданняў М. Лынькова, кнігі «Пад мірным небам» А. Стаховіча; раман «Глыбокая плынь» І. Шамякіна, выдадзены ў Балгарыі, зборнікі «Комуністы» А. Куляшова і «Вершы» П. Броўкі, выпушчаныя ў Румыніі. Экспануецца фотарэпрадукцыя вокладкі зборніка вершаў Я. Купалы, выдадзенага на кітайскай мове ў 1946 годзе ў Шанхаі.

Выстаўка адлюстроўвае вялікую працу, праробленую беларускімі пісьменнікамі па перакладах рускай класічнай і совецкай літаратуры. Тут — выдадзеныя на беларускай мове кнігі Л. Н. Талстога, І. С. Тургенева, М. Е. Салтыкова-Шчэдрына, А. П. Чэхава, М. Горкага, В. Маякоўскага, А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага, зборнікі твораў і анталогіі рускіх пісьменнікаў у перакладах на беларускую мову.

Асобны раздзел выстаўкі прысвечаны беларускай крытыцы і літаратуразнаўству.

Эдзі АГНЯЦВЕТ

Выдатны украінскі паэт

Да 50-годдзя з дня нараджэння Міколы Бажана

Далёка за межамі Украіны вядома паэзія Міколы Бажана — паэта-грамадзяніна, чалавека глыбокіх пачуццяў і думак.

Аднаму са сваіх ранніх вершаў М. Бажан даў назву, блізкую сэрцу паэта — «Песня байца».

І ми двічі вмерти змогли б
За чорний вугіль, за чорний хліб;
За чорні натруджені руки
Ми двічі умерти змогли б.

І кароткі дынамічны верш «Клятва», і напісаная ў форме іранічнай размовы з шэкспіраўскім героем паэма «Смерць Гамлета», і вялікі эпічны твор «Бессмяротнасць» з'яўляюцца сапраўднай гераічнай песняй байца, барацьбіта за мір.

Бійцям не можна спать на варті,
Плекать утому на лиці.
Чого-ж то будуть варті
Такі бійці?

І таму кожны радок яго верша — адточаны, выразны, дзейсны.

Мне давялося больш блізка пазнаёміцца з творчасцю М. Бажана ў час работы над перакладам на беларускую мову выдатнай паэмы «Бессмяротнасць». Яркай, выразнай абмалёўцы чалавечых характараў вучыць нас гэтая паэма.

«Тры аповесці пра таварыша Кірава» — такі падзагаловак паэмы.

1905 год. Халодны студзеньскі ранак у горадзе Томску. Сергей Кострыкаў разам з групай рабочых выступае са зброяй у руках супраць ненавіснага самаўладства. У часе сутычкі з царскімі казакамі загінуў яго лепшы друг Осіп Конанаў. Цяжка перажывае Кострыкаў смерць таварыша, але воля яго застаецца нязломнай.

З вялікай паэтычнай сілай малюе Бажан вобраз маладога Кірава, які з небяспекай для жыцця прабраўся ў анатамічны корпус універсітэта і схіліўся над целам забітага Осіпа.

У другім раздзеле паэмы мы бачым, як вырастае вобраз С. Кірава ад юнака-рэволюцыянера да арганізатара закаўказскіх большэвікоў, цесна звязанага з людзьмі розных моваў, з іх інтарэсамі і лёсам. Паэт паказвае ўнутраны свет героя, яго душэўны рост, думы і перажыванні.

Выключна эмацыянальна напісаны трэці раздзел паэмы; тут паказаны апошні дзень жыцця Сергея Міронавіча — чалавека, які ўсё сваё жыццё прысвяціў служэнню народу. Дзень яго напоўнены вялікімі клопатамі. Усё цікавіць Кірава, пачынаючы ад выпрабавання новай турбіны да правядзення стогадовага юбілею карэла-фінскага эпаса «Калевала». Мы бачым жывога, энергічнага, валявога Кірава, нястомнага ў сваіх марах і працы, прагнага да жыцця.

З незвычайным хваляваннем працавала я над перакладам паэмы М. Бажана «Бессмяротнасць», якая захапіла мяне сваёй вялікай мастацкай праўдай. Паэме ўласцівы яркія вобразы, дакладныя дэталі і дынамічны рытм, якія поўнасцю адпавядаюць настрою героя.

У свой час Паўло Тычына пісаў аб гэтай паэме, адзначаючы не толькі яскрава выяўленыя думкі, ідэі, але і музыку верша:

«Алітэрацыі ў яго настолькі матэрыяльныя, што можна да іх рукой дакрануцца». П. Тычына прыводзіць адзін з прыкладаў, калі ў паэта не толькі кожнае слова, але і кожная літара на месцы, як салдат у страю.

Той вецер у сцягу разгорнутым Кірава
Гудзеў, як прыбой і шаўкі калыхаў.
У жвір, у рыпенне някошаных траў
Упарта ступала нага камандзірава.

Мікола Бажан — паэт шырокага творчага дыяпазону. Аб гэтым сведчаць яго цудоўныя «Узбекістанскія вершы», вершы аб Грузіі, яго выдатны пераклад паэмы Шота Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры».

Вядомы «Сталінградскі сшытак», адзначаны Сталінскай прэміяй, быў напісаны паэтам ва ўмовах суровых баёў пад Сталінградам. Вершы з гэтага сшытка, напісанага крывёю сэрца, вызначаюцца праўдзівасцю, усхвалёванасцю, мужнасцю. Асабліва запамінаюцца «Вецер з усходу», «Каля хаты», «На пераправе», «На камандным пункце». Яны напісаны паэтам-барацьбітом у поўным сэнсе гэтага слова.

Жалезам і дымам, крывёю і пылам
Ты пахнеш і дыхаеш, вецер з усходу!
Ляці-ж сведкай бою над стэпам над мілым,
Да роднай краіны ляці, да народу.

Зайграй над Дняпром, засурмі над Сулою,
Узвейся за дальнія нашы Карпаты,
Каб стаў для народа ты голасам бою,
Каб стаў вестуном ты і весткай расплаты.

(«Вецер з усходу». Пераклад Р. Няхая).

Добра вядома многім і многім чытачам кніга «Англійскія ўражанні» Міколы Бажана. Паэт, які пабываў і ў дыпламатычных англійскіх колах, і ў лонданскіх рабочых кварталах, стварыў яркія карціны жыцця англійскага народа. Гэтыя вершы адыгрываюць вялікую ролю ў барацьбе за мір. Паэт успамінае, як некалі прыехалі сюды на пяты з'езд партыі ткачы з Іванава, рабочыя з Урала:

Так партыя мацнела і ўзрастала.
Рыхтуючы той час, той грозны дзень сігнала,
Калі ідзе праз гром дзевяты гнеўны вал, —
І цераз дзесяць год праракатаў сігнал.
І той, хто йшоў калісь вось тут праз цеміру ночы,
У красавіцкі вечар цераз дзесяць год
З браневіка рукой сваёй прарочай
Пакажа ўсім, куды трымаць паход.

(Пераклад К. Кірэенкі).

За цыкл вершаў «Англійскія ўражанні» Мікола Бажан удастоены Сталінскай прэміі.

М. Бажан удала спалучае сваю паэтычную работу з вялікай грамадскай і дзяржаўнай дзейнасцю. Ён — выбраннік народа, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР. Доўгі час працаваў у якасці намесніка старшыні Совета Міністраў Украінскай ССР. У сучасны момант з'яўляецца старшынёй Саюза совецкіх пісьменнікаў Украіны.

Не шкадуючы сіл, працуе Мікола Бажан, поўнасцю аддаючы народу плён свайго яркага таленту. Вялікай любоўю і пашанай карыстаюцца творы украінскага паэта ў беларускага чытача.

Гэтымі днямі ў Дзяржаўным выдавецтве БССР выходзіць на беларускай мове кніга выбраных твораў М. Бажана. Лепшыя беларускія паэты прымалі ўдзел у перакладах вершаў выдатнага майстра слова брацкай Совецкай Украіны.

Мастацкім калектывам — дзейсную творчую дапамогу

У раённых дамах культуры, сельскіх клубах і хатах-чытальнях Мінскай вобласці працуе больш 900 розных самадзейных гурткоў.

Увайшло ўжо ў традыцыю штогод падводзіць вынікі творчай работы мастацкай самадзейнасці на сельскіх і раённых аглядах і ў дні масавых святаў песні. Гэтыя агляды пераканаўча паказваюць, як разам з агульным уздымам культуры ў нашай краіне з году ў год расце ідэйны і мастацкі ўзровень сельскай самадзейнасці.

Вялікім святам сёлета будзе рэспубліканскі агляд сельскай мастацкай самадзейнасці. У ходзе падрыхтоўкі да агляду выявіліся і арганізоўваюцца новыя калектывы ў калгасах і МТС вобласці.

У парадку абмену вопытам работы калектывы мастацкай самадзейнасці раённых дамоў культуры выступаюць на сцэнах сельскіх і калгасных клубаў. Так Грэскі раённы Дом культуры зрабіў адзінаццаць выездаў з канцэртамі ў калгасы раёна, а таксама аказаў практычную дапамогу хатам-чытальням і калгасным клубам у арганізацыі гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Але ёсць яшчэ нямала такіх сельскіх і калгасных клубаў, дзе гурткі мастацкай самадзейнасці арганізаваны дрэнна або зусім адсутнічаюць. На вёсцы яшчэ вельмі мала аркестраў, танцавальных калектываў.

У Барысаўскім раёне, напрыклад, з 25 культасветустанаў толькі ў васьмі ёсць гурткі мастацкай самадзейнасці. Такую-ж карціну можна назіраць і ў Смалявіцкім, Старадарожскім, Стаўбцоўскім і Плешчаніцкім раёнах.

Значным недахопам многіх сельскіх самадзейных калектываў з'яўляецца невялікая колькасць іх удзельнікаў. Недастаткова прыцягваюцца калгаснікі і калгасніцы, работнікі МТС, уся самадзейнасць у большасці выпадкаў складаецца з вучняў школ. У многіх калгасах, сельсоветах, МТС няма рэгулярна дзеючых гурткоў, ствараюцца яны паспешліва і толькі ў перыяд падрыхтоўкі да агляду, а пройдзе агляд, і работа іх спыняецца.

Справядлівыя прэтэнзіі выказваюцца з боку калектываў мастацкай самадзейнасці да прафесійных работнікаў мастацтва. Загадам міністра культуры БССР прапанавана прыцягнуць да ўдзелу ў арганізацыі агляду мастацкай самадзейнасці творчых работнікаў тэатраў і мастацкіх калектываў; накіраваць у раёны кваліфікаваных спецыялістаў для аказання дапамогі ў падрыхтоўцы агляду. Аднак прадстаўнікі тэатраў Мінска, Саюза кампазітараў, Саюза пісьменнікаў не маюць ніякай сувязі з калектывамі мастацкай самадзейнасці нашай вобласці, не выязджаюць у раёны з практычнай дапамогай сельскім калектывам, не шэфствуюць над імі.

Сельскія калектывы мастацкай самадзейнасці чакаюць ад прафесійных работнікаў мастацтва дзейснай дапамогі.

А. МУЗЫКІН.

Выстаўка народнай творчасці

На выстаўцы народнай творчасці Нясвіжскага раёна, якая праходзіла ў Нясвіжы, былі паказаны творы самадзейных мастакоў раёна: карціны, вышыўкі, разьба па дрэву і інш. Шматлікія наведвальнікі добра ацанілі выстаўку ў сваіх запісах, якія яны пакінулі ў кнізе водгукаў.

Э. СЛЯПЦОЎ.

У музеі Яна Райніса

Ян Райніс жыва цікавіўся поспехамі беларускай літаратуры. Яшчэ ў 1916 г. на адной з нарад у Лазане (Швейцарыя) Я. Райніс падрыхтаваў выступленне аб беларускай літаратуры, якую ён добра ведаў. У музеі экспануюцца матэрыялы аб гэтай нарадзе з пометкамі Я. Райніса аб творчасці Я. Купалы і М. Багдановіча. Райніс асабліва любіў гэтых паэтаў і не раз памайстэрску перакладаў іх вершы на латышскую мову. Клапатліва захоўваў ён аўтограф верша М. Багдановіча «Край мой родны», які з архіва Я. Райніса цяпер трапіў у музей. Тут-жа фатаграфія Янкі Купалы, знойдзеная ў асабістых паперах паэта, кнігі Якуба Коласа і Кандрата Крапівы з даравальнымі надпісамі. Я. Колас напісаў: «Слаўнаму песняру Латвіі Яну Райнісу ад Якуба Коласа. 17 лістапада 1926 г.». К. Крапіва на сваёй кнізе зрабіў такі надпіс: «Народнаму латышскаму паэту на ўспамін. 19 лістапада 1926 г.». Гэтыя кнігі былі падараваны Райнісу ў час яго знаходжання ў Мінску. Тады-ж ён сфатаграфаваўся з групай беларускіх пісьменнікаў, і гэтая фотакартачка таксама дэманструецца ў музеі. Побач з Я. Райнісам — З. Бядуля, П. Глебка, К. Чорны, К. Крапіва.

Я. САДОЎСКІ.

Сельская бібліятэка

У Лядзенскай сельскай бібліятэцы ёсць шырокі выбар сельскагаспадарчай, палітычнай і мастацкай літаратуры. Сюды рэгулярна паступае калі 25 экземпляраў газет і часопісаў. Створаны тры бібліятэкі-перасоўкі для паляводчых брыгад суседніх калгасаў. Добра працуе загадчыца бібліятэкі комсамолка Зінаіда Пятроўна Грынкевіч, якая нядаўна скончыла Мінскі бібліятэчны тэхнікум. За кароткі час яна згуртавала вялікі актыў чытачоў, больш 300 чалавек. Запаўняючы фармуляр, Зінаіда Пятроўна знаёміцца з будучымі чытачамі, удумліва раіць ім, якія прачытаць кнігі. Яна па-мастацку афармляе літаратурныя выстаўкі, фотамантажы і плакаты. Нядаўна тут была арганізавана выстаўка твораў Н. Остроўскага. Выкладчыца Лядзенскай сярэдняй школы Е. С. Пруднік на літаратурным вечары, арганізаваным бібліятэкай, прачытала даклад «Жыццё і дзейнасць Н. Остроўскага». Бібліятэка рыхтуе канферэнцыю чытачоў па кнізе Івана Шамякіна «У добры час».

Аднак мала клапоціцца аб гэтай бібліятэцы сельскі совет і раённы аддзел культуры (загадчык т. Янчын). Не адрамантавана памяшканне для чытальнай залы, неабходна зашкліць вокны і паставіць печ.

В. ЛЫЗО.

Чэрвенскі раён.

Раённы краязнаўчы музей

У горадзе Рэчыцы адкрываецца раённы гісторыка-краязнаўчы музей. Для музея ў раённым Доме соцкультуры адведзена вялікая зала, абсталяваная неабходнай мэбляй, стэндамі і макетамі.

Работнікамі музея, сабраны каштоўны матэрыял па развіццю прамысловасці і сельскай гаспадаркі раёна, па гісторыі рэволюцыйнага руху, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны.

Рад важных матэрыялаў па гісторыі грамадзянскай вайны і партызанскаму руху ў раёне перададзены новаму музею Гомельскім абласным гісторыка-краязнаўчым музеем. Каштоўныя гістарычныя матэрыялы паступаюць у музей ад прыватных асоб — старажылаў горада.

М. КАРПАЧОЎ.

г. Рэчыца.

Студэнты — вёсцы

Студэнты Мінскага інстытута фізкультуры далі канцэрт мастацкай самадзейнасці для калгаснікаў сельскагаспадарчых арцелей «Ударнік» і «Барацьбіт» Крупскага раёна.

І. РАБКОЎ.

У Руткаўскім сельсавеце

Канцэрты ў падшэфным калгасе

Калектыў мастацкай самадзейнасці Новагрудскай трыкатажнай фабрыкі часта выступае з канцэртамі ў падшэфнай сельгасарцелі імя Сталіна. Тут імі наладжана звыш 8 канцэртаў. З цікавасцю прагледзелі хлебаробы спектаклі: «Сваты» і «Прапанова». Цёпла сустракаюць калгаснікі работніцу фабрыкі Людмілу Нікалаеўну Няхай, якая ча-майстэрску выконвае беларускія народныя песні.

У новым памяшканні

Непазнавальна змянілася аблічча вёскі Валковічы за гады совецкай улады. Калгаснікі жывуць у новых прасторных дамах. У кожнай хаце гаворыць радыё.

У цэнтры вёскі вырастае новы пасёлак. Гэта — сядзіба калгаса. У новым памяшканні размясцілася калгасная хата-чытальня. Тут праходзяць дыспуты па прачытаных кнігах, наладжваюцца лекцыі.

Лепшы паштальён

Вялікай павагай сярод жыхароў вёсак Гаравічы, Амневічы і Агароднікі карыстаецца паштальён Аляксандр Басюк. Падпіскай на газеты ў яго ахоплены ўсе жыхары. У час палявых работ ён прыносіць пошту непасрэдна ў поле. У абедзены перапынак праводзіць чыткі газет, расказвае хлебаробам аб падзеях за рубяжом.

А. ДЗІСКО.

Новагрудскі раён.

Спектакль без чэхаўскай паэзіі

□

А. БУТАКОЎ,

кандыдат мастацтвазнаўчых навук

□

Як гэта ні парадаксальна, але складанасць пастаноўкі чэхаўскіх п'ес іменна ў іх незвычайнай прастаце. П'есы Чэхава нельга «іграць» у звычайным, тэатральным сэнсе гэтага слова. Іх сюжэты, іх дзеянні немагчыма механічна і бясстрасна ўціскаць у рамкі сцэны. Сюжэты п'ес, лёс герояў Чэхава трэба перажываць. Прыйшоўшы на чэхаўскі спектакль, глядач павінен бачыць перш за ўсё не ігру артыстаў, а само рэальнае жыццё.

У «Чайцы», як і ва ўсіх п'есах А. Чэхава, таксама быццам усё проста. Але ў гэтай прастаце закладзена вялікая сіла ўздзеяння на чытача. Яна ўзмацняецца ў тэатры, калі глядач бачыць на сцэне гэтае, здавалася-б, звычайнае, нічым не падфарбаванае жыццё, аб якім расказвае А. Чэхаў.

Убачыць такое жыццё і спадзяваўся мінскі глядач у тэатры імя Янкі Купалы, які паставіў на сваёй сцэне чэхаўскую «Чайку». Але гэтыя спадзяванні не спраўдзіліся. Спектакль, які мог-бы з'явіцца значнай вяхой на творчым шляху тэатра, атрымаўся халодным і пасрэдным.

Тэатр валодае ўсімі творчымі сродкамі для стварэння сапраўднага чэхаўскага спектакля, але рэжысёр Л. Мазалеўская не здолела скарыстаць іх.

К. Станіслаўскі гаварыў, што ў «Чайцы» размова вядзецца не аб прыватным, а аб Чалавечым з вялікай літары. Выказваючы гэта, ён меў на ўвазе цэнтральны вобраз — Ніну Зарэчную.

«... Калі я думаю аб сваім прызванні, дык не баюся жыцця». Гэтыя словы Зарэчнай з'яўляюцца ключом для раскрыцця ідэі п'есы. Чалавек, які паверыў у сваё прызванне, знаходзіць шчасце жыцця толькі ў працы, у барацьбе за жыццё, — такая асноўная думка «Чайкі».

Але ў чэтры спектакля рэжысёр паставіў вобраз не Зарэчнай, а Трэплева — чалавека, не здольнага змагацца, які становіцца ахвярай сваёй слабасці. Таму чэхаўскі аптымізм і вера ў цудоўную будучыню, якія закладзены ў вобразе Ніны Зарэчнай, не загучалі ў спектаклі. Не створана своеасаблівая чэхаўская атмасфера, не ўскрыты ўсе падводныя плыні ў развіцці сюжэта. Вядомыя чэхаўскія паузы засталіся незапоўненымі жыццём вобразаў. Акцёры не здолелі прапусціць аўтарскі тэкст праз сваё «я», не раскрылі глыбока падтэксты ролей. Замест таго, каб зрабіць тэкст аўтара сваім, выканаўцы (у большасці сваёй) толькі дакладваюць, чытаюць яго.

Наш глядач добра ведае маладую артыстку Л. Драздову, ён палюбіў створаныя ёю вобразы сучасніц, дзе артыстка найбольш поўна праявіла свой свежы талент. Гэтага яна не змагла зрабіць у паэтычным вобразе Ніны Зарэчнай.

Ні ў якім выпадку мы не думаем сказаць, што Л. Драздова можа добра іграць толькі ў сучасным рэпертуары. Яна можа знайсці сабе мноства вялікіх і малых ролей і ў рускім, і ў заходнееўрапейскім класічным рэпертуары. Але ў дадзеным выпадку яна не здолела паказаць складаны, змястоўны вобраз чэхаўскай гераіні ў развіцці яе характару, у росце яе таленту.

Вобраз Ніны пабудаваны аўтарам на кантрастах. У першым акце Ніна — імклівая, наіўная і даверлівая дзяўчына, уся ахопленая ясным і чыстым пачуццём.

Праходзяць два гады. У апошнім акце п'есы Ніна зусім іншая. З бесклапотнай дзяўчыны яка ператвараецца ў жанчыну, якую жыццё не песціць радасцямі. Зарэчная перажывае смерць дзіцяці, разрыў з Трыгорыным, няўдачы на сцэне. Але жыццё не зламала гэтую жанчыну, а наадварот, загартавала яе. Ніна вырасла і ўзмужнела. Яна ўбачыла навакольны свет не праз ружовыя акуляры, як у маленстве, а такім, якім ён ёсць, ва ўсёй яго жорсткасці і несправядлівасці. Ніна цяпер ужо не бездапаможная прыгожая чайка, якую раптам убачыў і без дай прычыны загубіў халодны, раўнадушны чалавек. Характар Ніны стаў больш складаным. Яна знаходзіць у сабе сілы перамагчы і забыць усе пакуты. Пераадолеўшы выпрабаванні жыцця, Зарэчная ў тэатры, на сцэне знаходзіць свой сапраўдны талент. Цяпер яна ўжо не бездапаможная вучаніца, а прафесійная артыстка, якая іграе не са страхам, як раней, а «з асалодай, з захапленнем». З кожным днём у ёй спеюць і растуць вялікія душэўныя і творчыя сілы. Паверыўшы ў свой талент, Ніна смела імкнецца ў вадаварот суровага жыцця, змагаючыся за сваё месца ў ім. Яна знаходзіць, нарэшце, свой шлях і ведае, куды ідзе. Яна верыць, што прыдзе да сваёй запаветнай мэты — стане вялікай артысткай. У гэтай барацьбе за сваю мару Ніна выйдзе пераможцай, у процілегласць Трэплеву, які траціць веру ў свой талент і ўсё яшчэ носіцца ў хаосе летуценняў і гіне. У барацьбе з сапраўдным жыццём Ніну падтрымлівае мара аб будучыні, новым і радасным жыцці.

Іменна ў гэтым і заключаецца паэзія цудоўнага вобраза Ніны Зарэчнай і ўсёй чэхаўскай «Чайкі». І вось гэтай паэзіі не стае ў спектаклі, бо вобраз Ніны ў выкананні Л. Драздовай не развіваецца, не расце. Зарэчная-Драздова і ў чацвёртым акце амаль такая-ж, як у першым: тая-ж наіўнасць і летуценнасць, тая-ж дзіцячая дапытлівасць, парывістасць і лёгкасць у рухах. Глядач-жа хоча бачыць новую Ніну — узмужнелую жанчыну, якая смела ўступае на барацьбу за сваю будучыню, за свой талент.

Вобраз Канстанціна Трэплева ў спектаклі некалькі бліжэйшы да чэхаўскай задумы, чым вобраз Зарэчнай. Акцёр І. Шаціла, праўда, не ўсюды роўна і пераканальна, але ў асноўным верна раскрывае мітуслівую душу свайго героя. У трактоўцы І. Шацілы Трэплеў успрымаецца як ахвяра тагачаснага жыцця.

З першай-жа сцэны ў Трэплева-Шацілы адчуваецца асуджанасць, трагічнасць яго лёсу. І гэта правільна: жыццё Трэплева складанае і трагічнае. Але верна вызначыўшы ўнутраную лінію развіцця вобраза, І. Шаціла не паказвае нам самога развіцця, робячы тую-ж памылку, што і Л. Драздова. З першай і да апошняй сцэны Трэплеў у спектаклі парывісты і нервовы, гарачы і запальчывы, асуджаны на пагібель. У трактоўцы І. Шацілы ўзбуджанасць і нервовасць Трэплева маюць адценне хваравітасці, неўрастэнічнасці. Так, у першым акце, спыняючы паказ сваёй п'есы, Трэплеў, замест таго, каб шчыра і проста абурыцца бестактоўнасцю Аркадзінай, раптам злосна крычыць на яе. Глыбокае пачуццё знявагі і гневу выкачаўца падмяняе непрыемнай на сцэне злосцю. Злость — дробнае пачуццё, якое ніколі нікога не кранае. Таму глядач застаецца абыякавым да сцэны Трэплева з маці ў 3-м акце, дзе перажыванні і пакуты Трэплева асабліва павінны ўсхваляваць яго.

Трэплеў І. Шаціла больш сталы па ўзросту, больш вопытны ў жыцці, чым чэхаўскі Трэплеў — дваццацічатырохгадовы малады чалавек, які па маладосці не ўмее стрымліваць свае пачуцці.

У «Чайцы» няма герояў асабліва станоўчых або асабліва адмоўных. Героі Чэхава — людзі алначасова і добрыя і дрэнныя, цікавыя і звычайныя, якімі было багата сучаснае пісьменніку жыццё. Такі і Трыгорын — стомлены ад славы літаратар з вядомым імем. Гэта — разумны, таленавіты чалавек, у вусны якога аўтар укладаў свой погляд на мастацтва і літаратуру, на абавязак мастака-грамадзяніна. «... Я-ж яшчэ грамадзянін, — гаворыць Трыгорын, — я люблю радзіму, народ, я адчуваю, што калі я пісьменнік, дык я абавязаны гаварыць пра народ, пра яго пакуты, пра яго будучыню, гаварыць пра навуку, аб правах чалавека...» І ў той-жа час гэты патрыятычны і чулы мастак ледзь не гуоіць у Ніне мару аб тэатры, яе веру ў свой талент.

Не ўсе гэтыя складаныя супярэчнасці ў характары Трыгорына здолеў раскрыць артыст Б. Платонаў. Цяжка вызначыць той вобраз Трыгорына, які мы бачым у спектаклі. Ён застаецца няясным, нязначным, вялым. Высокія, паэтычныя словы Трыгорына аб грамадзянскім абавязку мастака не западаюць у душу гледача, не кранаюць яго, застаюцца незаўважанымі. Толькі адну рысу добра падкрэсліў акцёр у гэтым вобразе — яго бязвольнасць, бесхарактарнасць.

Ад такога вырашэння вобраза Трыгорына значна зніжаецца ўздзеянне спектакля, бо гэты вобраз нясе немалаважную нагрузку ў ідэйным змесце твора.

Думаецца, што і Ул. Уладамірскі не зусім правільна зразумеў сутнасць вобраза Дорна. Дорн у спектаклі — халодны і бессардэчны і некалькі грубаваты. А па задуме-ж Чэхава ў Дорна многа станоўчых якасцей. Здаровы і цвярозы розум, добрае веданне жыцця, вялікая любоў да працы, у якой ён бачыць сваё шчасце, бадзёрасць і жыццерадаснасць, — усё гэта падкупляе чытача ў чэхаўскім Дорне. Ды і тое адмоўнае, што ўклаў у гэты вобраз Чэхаў, не так значна, каб яго залішне падкрэсліваць і рабіць пераважным. У добрыя, глыбока праўдзівыя словы Дорна аб мастацтве («... Мастацкі твор абавязкова павінен выяўляць якую-небудзь вялікую думку», «... адлюстроўвайце толькі важнае і вечнае», «Вы павінны ведаць, для чаго пішаце...» і г. д.) выканаўца не ўкладвае вялікага сэнсу. Гэтыя мудрыя чэхаўскія словы Дорн у спектаклі гаворыць то з празмернай іроніяй, то жартаўліва. Ды і ўвесь яго воблік у спектаклі некалькі жартаўлівы, ён над усім іранізуе, любуецца сабой.

У п'есе Дорн — чыстая і светлая душа, чулая і спачувальная натура. Невыпадкова стомленая ад кахання Маша так даверліва цягнецца да Дорна, хоча расказаць яму пра сваё гора, чакае ад яго маральнай падтрымкі. Дорн спачувальна ставіцца да пакут дзяўчыны, хоць ясна разумее, што дапамагчы ёй не можа. Ласкава і пяшчотна ён супакойвае Машу: «Ну, што-ж я магу зрабіць, дзіця маё? Што?..» У Ул. Уладамірскага гэтыя словы гучаць з той-жа халоднай іроніяй і абыякавасцю, у іх няма ні кроплі цеплыні, як няма яе ва ўсім сцэнічным вобразе Дорна.

Недакладна захарактарызаваны ў спектаклі і вобраз Аркадзінай артысткай О. Галінай. Па задуме Чэхава Аркадзіна самалюбівая эгаістка, ілжывая, неразумная, хутка пераходзіць ад аднаго настрою да другога. Яна — артыстка з вялікім вопытам і славай, натура неўраўнаважаная ў сваіх жаданнях, адначасова і пяшчотная і грубая (у сцэне з сынам), дабрадушная і эгаістычная (у сцэне з Зарэчнай і Трыгорыным), мілая і добрая, раўнівая і скупая. У некаторых сцэнах О. Галіна ўдала падкрэслівае асобныя рысы ў характары Аркадзінай (ганарыстасць і эгаізм — у сцэне паказу трэплеўскай п'есы, пяшчотнасць і зласлівасць — у сцэне з сынам, скупасць — у сцэне з братам і слугамі). Але цэльнасці і закончанасці няма ў вобразе Аркадзінай у выкананні О. Галіны.

Злосна і зняважліва крычыць Аркадзіна на сына: «Дэкадэнт!.. Прыжывал!.. Абадранец!.. Нікчэмнасць!..». Але тут нешта большае, чым звычайная сямейная сварка паміж грубай маці і капрызным, хворым сынам. Гэта не звычайная сварка, а поўны разрыў Трэплева з маці. Пасля разрыву і адыходу Ніны Трэплеў траціць творчае натхненне, спадзяванне на шчасце ў жыцці і канчае самагубствам. Разрыў з маці цягне за сабой трагічны вынік і таму павінен вырашацца глыбей, больш сур'ёзна.

Недастаткова падкрэсліла выканаўца ілжывасць Аркадзінай, яе ўменне спрытна прытварацца. Імкнучыся ўтрымаць каля сябе Трыгорына — «апошнюю старонку» свайго жыцця, Аркадзіна кідаецца на хітрасць. Яна раптам падае перад Трыгорыным на калені, абвівае яго ногі, цалуе рукі, асыпае яго спакушальнымі эпітэтамі: «Мой цудоўны, дзівосны... Мая радасць, мая гордасць...» Гэтыя ласкавыя словы вылятаюць з вуснаў Аркадзінай з той-жа лёгкасцю, як словы знявагі па адрасу сына. У гэтай сцэне з Трыгорыным (трэці акт) Аркадзіна ўмела карыстаецца ўсімі сродкамі вопытнай, прафесійнай артысткі, якая прывыкла іграць у жыцці гэтак-жа лёгка, як і на сцэне. Наўрад ці кіруе тут ёю сапраўднае каханне да Трыгорына? Аркадзіна дзейнічае хутчэй у абарону свайго хворага жаночага самалюбства, бо не можа дазволіць, каб у яе прысутнасці гаварылі аб іншай жанчыне, ды яшчэ кахалі яе! Трыгорын здаецца.

«Цяпер ён мой», — радуецца перамозе Аркадзіна.

Ігра скончана. Як ні ў чым не бывала, яна абыякавым і злёгку іранічным тонам рэзюмуе: «Між іншым, калі хочаш, можаш застацца». У спектаклі-ж Аркадзіна ў гэтай сцэне не вынаходлівая і хітрая, не небяспечная ў сваёй ілжывасці, а некалькі вялая і анемічная, мала актыўная і неэнергічная ў сваім прытворстве.

Артыстка Е. Рынковіч падкрэслівае толькі адну рысу ў вобразе яркага і прыгожага чалавека Машы, чым збядняе вобраз і не да канца раскрывае свае магчымасці ў ім. Яе Маша толькі сумуе ад безнадзейнага кахання і часам становіцца змрочнай, злоснай, антыпатычнай. Такая яна ў чацвёртым акце, дзе замест трагічных перажыванняў ад няўдалага жыцця яна толькі злуецца на ні ў чым не вінаватага Мядзведзенку. Артыстка не заўважыла ў ролі таго, што Маша бывае рашучая і актыўная, калі яна прабуе змагацца за жыццё. У яе, напрыклад, хапіла сілы волі рашыцца выйсці замуж за Мядзведзенку, каб скончыць са сваім безнадзейным каханнем. Значыць, у вобразе Машы не толькі смутак, сумныя вочы і вечна цёмнае плацце. У ім павінны быць раскрыты перш за ўсё глыбокія перажыванні і вялікае ўнутранае жыццё.

Вельмі аднастайны ў спектаклі і Мядзведзенка — гэты добры і сумленны чалавек, які кахае моцна і глыбока. Акцёр Ул. Сярпкоў не выяўляе трагедыю гэтага маленькага чалавека — сельскага настаўніка, сціплага працаўніка. У яго выкананні Мядзведзенка — непаваротлівы і тупаваты чалавек. На 23 рублі, якія ён атрымлівае ў месяц за цяжкую, але няўдзячную ў царскай Расіі працу настаўніка, яму трэба пракарміць сябе, маці, двух сясцёр і брата. Гэтаму настаўніку вельмі цяжка жыць, але ён у Чэхава не такі ўжо песіміст, як у Ул. Сярпкова ў спектаклі. Ён не ные і шчыра ажыўляецца, звяртаючыся да Трыгорына з законным патрабаваннем: «А вось, ведаеце, апісаць-бы ў п'есе і потым сыграць на сцэне, як жыве наш брат настаўнік. Цяжка, цяжка жывецца!» Наўрад ці прыдзе такая смелая і верная думка ў галаву таго Мядзведзенкі, якога іграе Ул. Сярпкоў. Вобраз настаўніка вельмі спрошчаны ў спектаклі, як і вобраз Шамраева ў выкананні С. Бірылы.

Зусім інакш ра крыта ў спектаклі трагедыя другога ціхага і непрыкметнага, але сумленнага і простага чалавека. Гутарка ідзе аб вобразе Сорына ў выкананні П. Малчанава. Гэта адзіны персанаж у спектаклі, які іграецца з пераканальнай і прывабнай чэхаўскай праўдай і прастатой. Акцёр трапна ўлавіў той тонкі чэхаўскі тон, якога нехапае іншым вобразам і ўсяму спектаклю ў цэлым.

Выканаўца праўдзівай і мяккай ігрой, у якой многа падкупляючай прастаты, цеплыні і дабрадушнага гумару, здолеў данесці да гледача смутак, выкліканы нікчэмна пражытым жыццём.

Сумнае, цяжкае пачуццё жалю выклікае вобраз Сорына, які ўсё жыццё дарэмна марыў аб чатырох рэчах: зрабіцца літаратарам, гаварыць прыгожа, ажаніцца і заўсёды жыць у горадзе. Усё гэта Сорыну не ўдалося, але пачуццё аптымізма і любві да жыцця не пакідае гэтага чалавека, хоць ён і пражыў свой век. У старэчай хадзе знясіленага хваробай чалавека, у яго бясколерных маленькіх вачах выразна відаць і ласкавае пачуццё да людзей, і пакуты ад усведамлення бязмэтнага, нецікавага мінулага жыцця, і сум па новым жыцці, непадобным на гэтую шэранькую і сумную рэчаіснасць.

П. Малчанаў здолеў глыбока пранікнуць у псіхалогію Сорына, здолеў намаляваць праўдзівы і прывабны ў сваёй прастаце вобраз.

Прастата і праўда выканання ўласцівы і С. Станюце ў ролі Паліны Андрэеўны.

Астатнія-ж выканаўцы не змаглі ў поўнай меры справіцца з цяжкай задачай раскрыцця чэхаўскіх вобразаў ва ўсёй іх праўдзе і прастаце.

Калектыў прыклаў у рабоце над «Чайкай» працу не малую, але не крапатлівую і ўдумлівую, якой патрабуюць п'есы Чэхава.

Ад такога буйнага калектыву, як тэатр імя Я. Купалы, у якім плённа працуе асноўная група вядучых майстроў беларускай сцэны, глядач мае права патрабаваць сапраўднага, сур'ёзнага і глыбокага прачытання цудоўнай чэхаўскай драматургіі.

Павышаць і ўдасканальваць майстэрства

Операй Мусаргскага «Барыс Гадуноў» адкрыў свой 22-гі сезон Беларускі дзяржаўны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балету.

Тэатр мае несумненныя поспехі ў сваёй рабоце. Спектаклі «Барыс Гадуноў», «Аіда», «Спячая прыгажуня», пастаўленыя ў мінулым сезоне, сведчаць аб узросшым майстэрстве калектыва, аб росце яго вакальнага і харэаграфічнага майстэрства.

Аднак было-б памылкай за дасягненнямі не бачыць тых сур'ёзных недахопаў, якіх трэба пазбегнуць у гэтым сезоне.

Адной з неадкладных задач тэатра з'яўляецца выхаванне маладых майстроў вакальна-сцэнічнага і танцавальнага мастацтва. Трэба аддаць належнае тэатру — ён смела вылучае здольную моладзь на адказныя партыі. Так, напрыклад, Т. Ніжнікава ў мінулым сезоне спявала партыю Віялеты, Н. Дзвіняжнава — Аіды, А. Думанян — Тамары, Р. Асіпенка — Улі, С. Удавічэнка — Фаўста, Л. Бражнік і Ул. Лубяной — Пімена, Л. Ражанава выконвала ролю Аўроры. Можна назваць яшчэ рад маладых здольных артыстаў, якія выконваюць адказныя партыі.

Разам з тым вопытныя майстры тэатра вельмі мала працуюць з маладымі артыстамі.

Вялікім недахопам у мінулым сезоне была нездавальняючая работа па пашырэнню рэпертуару за лік савецкіх і ў прыватнасці беларускіх опер і балетаў. Творчы калектыў не праявіў ініцыятывы і па сутнасці пакінуў у баку пытанне аб рабоце з кампазітарамі і драматургамі. Таму не дзіва, што тэатр за апошнія пяць год, апрача «Дзяўчыны з Палесся», не паставіў ніводнай новай арыгінальнай оперы. Несумненна, што кампазітары павінны прыносіць у тэатр закончаныя творы ў партытуры. Аднак дапамога калектыва не выключаецца. Наадварот, яна павінна быць больш дзейснай і рэальнай. Калі-б тэатр сапраўды зацікавіўся такімі операмі, як «Андрэй Касценя» М. Аладава, «Надзежда Дурава» А. Багатырова, «Песня аб шчасці» Д. Лукаса і «Машэка» Р. Пукста, кампазітары змаглі-б давесці свае творы да больш высокага ўзроўню і зрабіць іх вартымі для пастаноўкі на сцэне тэатра.

У рэпертуарных афішах новага сезона абвешчана пастаноўка дзіцячай оперы «Марынка» Р. Пукста (лібрэта Эдзі Агняцвет). Будзе добра, калі тэатр давядзе гэтую пачатую справу да канца і не пакіне яе абяцанкай, як гэта нярэдка бывала ў практыцы тэатра.

Незразумела таксама, чаму тэатр не аднаўляе ў сваім рэпертуары раней пастаўленыя оперы «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага і «У пушчах Палесся» А. Багатырова.

Усё гэта ўзятае разам стварыла такое становішча, што вось ужо два гады оперны тэатр выязджаў на гастролі, не маючы ў сваім рэпертуары ніводнай беларускай оперы і балету.

У новым сезоне глядач убачыць оперы «Руслан і Людміла» Глінкі (у сувязі са 150-годдзем з дня нараджэння вялікага рускага кампазітара) і «Отэло» Вердзі. Хацелася, каб салісты ў новых спектаклях больш увагі аддавалі павышэнню вакальнага майстэрства, працавалі-б над чысцінёй інтанацый, а дырыжоры ў сваю чаргу дамагаліся ад выканаўцаў высокага прафесійнага майстэрства і глыбокага музычнага раскрыцця вобразаў і, самае галоўнае,—хочацца пошукаў арыгінальнага рашэння спектакляў, а не капіроўкі сталічных пастановак.

У рэпертуары тэатра ідзе толькі адна опера Рымскага-Корсакава. Ці не час падумаць, каб даць магчымасць гледачу ўбачыць такія шэдэўры рускай оперы, як «Снягурачка», «Садко», «Казка пра цара Салтана», «Майская ноч», «Сказанне аб градзе Кіцежы» Рымскага-Корсакава?

З такой-жа падставай можна папракнуць тэатр за тое, што ён абыходзіць цудоўныя творы кампазітараў брацкіх рэспублік. Такія оперы, як «Абесалом і Этэры» Паліашвілі, «Багдан Хмельніцкі» Данькевіча, «Севіль» Амірава, «Алмаст» Спендзіарава маглі-б упрыгожыць яго рэпертуар.

Слаба папаўняецца балетны рэпертуар. У новым сезоне тэатр ставіць толькі адзін новы балет «Лаурэнсія» Крэйна, між тым, як танцавальны калектыў можа ажыццявіць два-тры балеты. Такая пасіўнасць не можа мець месца ў рабоце тэатра, калі ўлічыць, што на яго сцэне не ідуць такія цудоўныя балеты, як «Шчалкунчык» Чайкоўскага, «Раймонда» Глазунова, «Медны коннік» Гліэра, «Сем прыгажунь» Караева, «Сказ аб каменнай кветцы» Пракоф'ева і многія іншыя.

У на тупным сезоне калектыў абавязаны павесці рашучую барацьбу за культуру спектакля, за высокае сцэнічнае ўвасабленне опер і балетаў. Неабходна дамагчыся, каб усе спектаклі былі на такім-жа ўзроўні, на якім звычайна бываюць прэм'еры. На жаль, гэта далёка не так. Праходзіць час, і спектакль траціць тэмп, прывабнасць; выканаўцы забываюць указанні рэжысёра і ўносяць адсябіцыну, зношваюцца дэкарацыі, чарнеюць фарбы, блякнуць колеры, дзе-ні-дзе з'яўляецца фальш як у хоры, так і ў аркестры, і пастаноўка губляе сваю прыгажосць. У многім гэта датычыць такіх спектакляў, як «Князь Ігар», «Іван Сусанін», «Еўгеній Онегін» і інш. Не лепшае становішча і з балетнымі спектаклямі.

Танцавальны калектыў балету «Князь-возера» яшчэ не сустракаўся з балетмайстрам К. Галейзоўскім, які запрошаны для кансультацыі гэтай пастаноўкі.

Нельга яшчэ забываць, што многае трэба зрабіць, каб удасканаліць спектаклі «Дзяўчына з Палесся» і «Страшны двор». У тэатры яшчэ няма таго творчага ўздыму, у працэсе якога ствараюцца яркія спектаклі, узнікаюць сапраўды высокія адносіны да работы.

Тэатр оперы і балету валодае дастатковым вопытам, моцным кіруючым складам і добрымі выканаўчымі сіламі. Большая палова салістаў — таленавітая моладзь, якая прыйшла ў тэатр у апошнія гады. Сёлета запрошана новая група маладых выканаўцаў. Гэта — З. Лапчанка (сапрано), якая скончыла Маскоўскую кансерваторыю, А. Генералаў (барытон) і Ул. Арленін (тэнар) — выпускнікі інстытута Гнесіных і Г. Дзмітрыеў (тэнар) — артыст Яраслаўскай філармоніі. Усе яны працуюць над партыямі і хутка ўвойдуць у вядучы склад оперных спектакляў.

Першыя спектаклі тэатра ў новым сезоне гавораць аб тым, што калектыў удасканальвае сваё вакальнае сцэнічнае і танцавальнае майстэрства, што аркестр павысіў сваю выканаўчую культуру. Аднак зроблены яшчэ толькі першыя крокі. У тэатра ёсць усе ўмовы для таго, каб лепш змагацца за стварэнне спектакляў высокага ідэйна-мастацкага ўзроўню.

Б. СМОЛЬСКІ.

Новая архітэктура Віцебска

Нядаўна ў Віцебску па запрашэнню Упраўлення па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў БССР і Саюза савецкіх архітэктараў Беларусі сабраліся прадстаўнікі амаль усіх праектных арганізацый Мінска і многіх іншых гарадоў рэспублікі. Яны заслухалі даклад галоўнага інжынера Віцебскага філіяла «Белдзяржпраекта» В. Чарнышова «Аб практыцы праектавання і ансамблевай забудовы горада Віцебска» і садаклад намесніка начальніка Упраўлення па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў БССР В. Гусева, азнаёміліся з выстаўкай макетаў-праектаў забудовы асноўных магістралей горада.

В. Чарнышоў расказаў аб пачатку вялікіх работ па аднаўленню і поўнай рэканструкцыі прывакзальнай плошчы і вуліцы Кірава, якая злучае гэтую плошчу з Заходняй Дзвіной праз мост і ідзе далей — на Замкавую.

Гэта будзе адна з прытажэйшых вуліц горада. Шырыня яе 66 метраў. Паабапал вуліцы ўжо ўзнімаюцца чатырох- і пяціпавярховыя будынкі.

З вуліцы Кірава, ад Заходняй Дзвіны можна ўбачыць не менш прыгожую панараму Замкавай. Гэтая вуліца будзе пачынацца злева велічным будынкам драматычнага тэатра, а з другога боку — адміністратыўным будынкам сувязі. З Замкавай вуліцы — выхад на другую цэнтральную магістраль горада — вуліцу Леніна, у канцы якой будзе размешчана плошча Леніна і плошча Свабоды.

Выступленні на нарадзе зводзіліся па сутнасці да аднаго: калектыў архітэктараў Віцебска нядрэнна распрацаваў і ажыццяўляе праекты забудовы асноўных магістралей горада. Усім спадабалася вельмі ўдалае рашэнне пытання аб аднаўленні прывакзальнай плошчы і прымежных да яе вуліц імя Кірава і Замкавай.

Аднак забудоўшчыкі горада не заўсёды ўлічваюць узросшыя патрэбы насельніцтва ў культурным і бытавым абслугоўванні. Было выказана пажаданне — будаваць жылыя кварталы вуліц так, каб жыхары мелі магчымасць карыстацца бліжэйшым бульварам, каб каля двароў ці за дварамі былі абсталяваны рознага роду пляцоўкі — дзіцячыя, баскетбольныя і г. д.

Удзельнікі нарады справядліва крытыкавалі будаўнікоў Віцебска за тое, што яны пакінулі па-за ўвагай упрыгожанне набярэжных. Амаль ні ў адным з гарадоў нашай рэспублікі няма такіх цудоўных прыродных умоў, такога цудоўнага гарадскога рэльефу, як у Віцебску. Праз горад працякаюць тры ракі—Заходняя Дзвіна з надзвычай маляўнічымі высокімі берагамі і прытокі яе—Віцьба і Лучоса. Аднак берагі рэчак знаходзяцца ў вельмі запушчаным стане. Яны зараслі дзікім хмызняком. Ні ў адным месцы не пабудавана добрага спуску да ракі. А берагі рэчак у Віцебску можна і трэба зрабіць месцам культурнага і здаровага адпачынку. Цяпер-жа ў цэнтры горада па берагах Заходняй Дзвіны цягнецца дрэўляны склад, быццам для яго не знайшлося-б месца за горадам.

У Віцебску амаль нічога не робіцца і ў галіне азелянення горада — стварэння буйных зялёных масіваў — паркаў культуры і адпачынку, садоў, бульвараў. А магчымасці для гэтага ёсць неабмежаваныя.

М. МАКАЕЎ.

Віцебск.

Напярэдадні рэспубліканскага агляду мастацкай самадзейнасці

Гомель

Закончыліся агляды сельскай мастацкай самадзейнасці ў трыццаць адным раёне Гомельскай вобласці.

З цікавымі праграмамі выступілі калектывы Ельскага, Васілевіцкага, Калінкавіцкага, Чачэрскага, Брагінскага і іншых раёнаў вобласці.

Многа харавых калектываў будзе прадстаўлена на абласным аглядзе. Сярод іх — хоры калгаса «Новае жыццё» Тураўскага раёна, Залескай хаты-чытальні Чачэрскага раёна, Дыражыцкага сельскага савета Лоеўскага раёна, Ліплянскай хаты-чытальні Лельчыцкага раёна і многія іншыя.

Рыхтуюцца да агляду аркестры народных інструментаў Чачэрскага, Стрэшынскага, Гомельскага раёнаў. Хор Юравіцкага сельскага клуба Калінкавіцкага раёна падрыхтаваў рад беларускіх народных песень.

З цікавымі дасягненнямі прыйшла да абласнога агляду самадзейнасць Васілевіцкага раёна. Асаблівай увагі заслугоўвае аркестр народных інструментаў, у выкананні якога ёсць вялікі рэпертуар з рускіх, беларускіх песень і танцаў, а таксама твораў мясцовага самадзейнага кампазітара С. Анісімава.

Значна вырас харавы калектыў калгаса імя Варашылава Гомельскага раёна. Пры гэтым калектыве арганізавалася танцавальная група з дзяўчат-калгасніц. Пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтва БССР А. Рыбальчанкі група рыхтуе беларускі танец «Мяцеліца».

На раённых аглядах выявіўся і рад недахопаў. Загадчыкі раённых аддзелаў культуры ў Петрыкаве (т. Чыжык), у Добрушы (т. Асадчы), у Нароўлі (т. Бандарэнка) за перыяд падрыхтоўкі да раённых аглядаў амаль нічога не зрабілі, каб дапамагчы арганізаваць і стварыць спрыяючыя ўмовы ў рабоце самадзейнасці. У выніку раённыя агляды былі непадрыхтаваныя, хоць у гэтых месцах ёсць вельмі здольная моладзь.

О. КУЛЯШОВА.

Маладзечна

У канцы верасня ў Маладзечанскай вобласці пачаліся сельскія і раённыя агляды сельскай мастацкай самадзейнасці і ў кастрычніку — абласны агляд. Адначасова з аглядамі ў раёнах будуць праведзены раённыя выстаўкі прыкладнога і выяўленчага мастацтва.

У дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці былі праведзены — абласны семінар мастацкіх кіраўнікоў і абласны семінар самадзейных майстроў вобласці з выездам іх на экскурсію ў Мінск, дзе яны наведалі мастацкія майстэрні прафесійных майстроў. Праведзены абласны семінар цымбалістаў і самадзейных кампазітараў вобласці, на якім было разабрана 25 твораў самадзейных кампазітараў. Лепшыя творы, як «Комсамольскі марш», «Залатое поле» Ф. Наумчыка (Паставы), «У Палессі» А. Чараднічэнкі (Глыбокае), песня Б. Гембіцкага (г. Крывічы) і В. Багатава (Паставы), пасланы ў самадзейныя калектывы і будуць выкананы харавымі калектывамі на аглядах.

Арганізаваны харавы калектыў у Опсаўскай школе механізацыі Браслаўскага раёна. У яго рэпертуары — песні савецкіх кампазітараў і беларускія народныя песні. Механізатары ўдзельнічаюць таксама ў струнным і танцавальным калектывах і выступяць перад гледачамі на аглядзе.

У вобласці ёсць сем'і музыкантаў. Гэта калгаснікі калгаса імя Маякоўскага Івянецкага раёна—Лембовіч (бацька, тры сыны і дзве дачкі), якія рыхтуюць да агляду песні савецкіх кампазітараў і беларускія народныя песні і танцы; Забелы—сям'я баяністаў (Плыскі раён), якая таксама рыхтуецца да агляду.

На аглядзе выступіць і абласны цымбальны аркестр.

Добра ідзе падрыхтоўка да аглядаў у Мядзельскім, Докшыцкім, Дунілавіцкім, Вілейскім, Дзісненскім і іншых раёнах. Работнікі раённых аддзелаў культуры і раённага Дома культуры часта выязджаюць у сельскія калектывы і аказваюць дапамогу ў падрыхтоўцы да аглядаў.

Адначасова з правядзеннем аглядаў будуць праведзены і выстаўкі прыкладнога і выяўленчага мастацтва.

Многа цікавых работ да выстаўкі рыхтуюць самадзейныя майстры. Скульптар П. Герасіменка (м. Далгінава) працуе над скульптурай «Дружба народаў», скульптар Жываеў (ст. Залессе Смаргонскага раёна) закончыў бюст Горкага і працуе над скульптурамі «Сельскі настаўнік» і «Выдатніца», скульптар А. Пупко (м. Івянец) закончыў бюст М. В. Фрунзе і скульптуру «Ураджай», калгаснік Гальшанскага сельсавета Ашмянскага раёна І. Багрыцэвіч працуе над карцінай «Жніво», калгаснік Іжанскага сельсавета Вілейскага раёна І. Бохан рыхтуе камплект беларускіх народных інструментаў. Многа цікавых работ рыхтуюць да выстаўкі вышывальшчыцы, ткачыхі.

Але ёсць рад раёнаў, якія да гэтага часу не разгарнулі па-сапраўднаму падрыхтоўку да аглядаў, мала аказваюць дапамогі сельскім калектывам. Гэта Браслаўскі, Крывіцкі, Маладзечанскі, Радашковіцкі, Валожынскі раёны.

Раённыя камісіі па падрыхтоўцы і правядзенню аглядаў, створаныя ў гэтых раёнах, мала аддаюць увагі падрыхтоўцы да аглядаў, лічаць, што гэта справа толькі работнікаў аддзела культуры.

О. ДЫГАЙЛА.

Жлобін

Заслона адкрываецца, і перад шматлікімі гледачамі, якія запоўнілі прасторную залу Чацвернянскага сельскага клуба, — невялікі харавы калектыў. Цёпла ўспрымаюць слухачы выкананне беларускіх народных песень «Як крыніца цяча», «Ці ўсе лугі пакошаны». Заслужаны поспех выпаў маладому харавому калектыву Чацвернянскага сельсавета, якім кіруе настаўніца Чарняўская.

На аглядзе мастацкай самадзейнасці Жлобінскага раёна паспяхова дэманстравалі сваё майстэрства і іншыя калектывы, сярод якіх можна адзначыць калектывы торфапрадпрыемства «Лукская», Жлобінскага вагоннага дэпо, Лукскай хаты-чытальні, Пірэвіцкага дзіцячага дома і інш. Усе яны прымуць удзел у абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці.

Д. ЗІНГЕР.

Сустрэчы сяброў

6 кастрычніка з Мінска ў Варшаву выехала дэлегацыя Таварыства польска-савецкай дружбы, якая гасцила каля месяца ў рэспубліцы па запрашэнню Беларускага таварыства культурнай сувязі з заграніцай.

За час знаходжання ў Беларусі госці пабывалі ў культурна-грамадскіх установах і на прадпрыемствах Мінска, Гомеля, Магілёва, Гродна і Новагрудка, сустрэліся з віднымі вучонымі і грамадскімі дзеячамі, выязджалі ў некаторыя калгасы рэспублікі, прысутнічалі на 3-м з'ездзе пісьменнікаў БССР.

На мінулым тыдні члены польскай дэлегацыі сустрэліся з беларускімі пісьменнікамі. Намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Польшчы Станіслаў Рычард Дабравольскі, пісьменнік Чэслаў Цэнткевіч, прафесар Генрых Яблонскі, сакратар Галоўнага ўпраўлення Саюза сялянскай узаемадапамогі Марыя Камінская расказалі аб развіцці літаратуры і навукі ў Польскай Народнай Рэспубліцы, аб папулярнасці твораў савецкіх пісьменнікаў сярод польскіх чытачоў.

Пісьменнікі К. Крапіва, М. Танк, Я. Брыль, А. Якімовіч, П. Кавалёў пазнаёмілі гасцей з творчым жыццём пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі, падзяліліся думкамі аб пашырэнні творчых сувязей паміж беларускімі і польскімі пісьменнікамі.

Усюды сустрэчы праходзілі ў цёплай сяброўскай абстаноўцы.

На здымку: член польскай дэлегацыі **Марыя Камінская** гутарыць з заслужаным дзеячом мастацтва БССР **Тацянай Лапацінай.**

Фото Д. Прэса і Г. Масальскага.

Канцэрт польскіх артыстаў

З вялікім поспехам прайшлі ў Мінску, Гродна, Гомелі, Бабруйску канцэрты польскіх выканаўцаў Эдварда Статкевіча (скрыпка) і Тадэўша Жмудзінскага (раяль).

У сталіцы Беларусі польскія госці выступілі ў сімфанічным канцэрце з выкананнем выдатных твораў Веняўскага, Шапэна, Шымэноўскага і іншых польскіх кампазітараў. Канцэрт пачаўся выкананнем бліскучага паланеза Шапэна і яго вальса ў перакладзе для сімфанічнага аркестра.

Канцэрт для скрыпкі і аркестра буйнейшага польскага кампазітара Веняўскага быў выкананы скрыпачом Э. Статкевічам і аркестрам на добрым мастацкім узроўні. Польскі выканаўца валодае добрай тэхнікай, і гэта дазваляе яму лёгка пераадольваць віртуозную фактуру канцэрта. Пранікнёна прагучала сярэдняя частка канцэрта — раманс. Цёпла былі прыняты аўдыторыяй дробныя п'есы Анаджыеўскага «Бурлеска» і Бацэвіча «Танец Мазовецкі». Віртуозная імправізацыя (сола скрыпкі) Ліпінскага была цудоўна выканана тэхнічна.

Канцэрт для фартэпіяно з аркестрам Шапэна пакінуў у выкананні артыста Т. Жмудзінскага і аркестра глыбокае ўражанне. Піяніст здолеў раскрыць і данесці да слухачоў усю прывабнасць і прыгажосць гэтага цудоўнага твора, створанага Шапэнам у маладосці. У мастацтве Шапэна, як пісаў савецкі акадэмік Б. Асаф'еў,— «...уся Польшча — яе народная драма, яе быт... яе думы і песні... бачыш людзей, іх рухі і жэсты; праз напевы чуецца душа народа».

У канцэрце чуецца то рытм бадзёрай мазуркі, то інтанацыі народных напеваў, то ўсхваляваныя пачуцці чалавека. Т. Жмудзінскі з вялікім поспехам сыграў увесь канцэрт, асабліва лірычныя эпізоды, якія вылучаюцца вялікай пявучасцю. Варыяцыі Шыманоўскага піяніст сыграў бліскуча. Цудоўна і тонка былі выкананы мазуркі Шапэна.

Канцэрт польскіх артыстаў паказаў, што ў іх асобе Польская Народная Рэспубліка мае таленавітых выканаўцаў, якія могуць на высокім мастацкім узроўні данесці да слухачоў цудоўныя творы польскай музыкі. Сімфанічны аркестр Беларускай дзяржаўнай філармоніі пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтва БССР М. Шнейдэрмана садзейнічаў поспеху польскіх гасцей.

С. БАБРОЎСКІ.

Валерый Брусаў

Да 30-годдзя з дня смерці

У гісторыі перадрэволюцыйнай рускай паэзіі імя Валерыя Брусава заўсёды стаяла ў ліку прадстаўнікоў крайніх мадэрнісцкіх плыней. У той-жа час яго сучаснікам цяжка было-б назваць паэта, які так цесна быў-бы звязаны з жывейшымі праблемамі рэчаіснасці.

В. Брусаў, які пачаў сваю дзейнасць у лагеры буржуазнай упадніцкай культуры, у далейшым прайшоў складаны і слаўны шлях ачышчэння ад усялякага мадэрнісцкага смецця. Ён мужна звязаў сваю творчасць з лепшымі прагрэсіўнымі ідэямі, пераадолеў індывідуалізм, дастойна сустрэў Вялікі Кастрычнік і, уступіўшы ў рады Камуністычнай партыі, прыняў самы жывы ўдзел у будаўніцтве маладой савецкай культуры.

Сваімі літаратурнымі настаўнікамі ён прызнаў не мудрагельскіх дэкадэнтаў упадніцкага Захаду, а Пушкіна і антычных паэтаў. Яшчэ ў дзевяцісотых гадах ён рэзка заявіў аб сваім разрыве з камернымі прынцыпамі сучаснай яму дэкадэнцкай паэзіі і свае лепшыя творы, якія сталі класічнымі, прысвяціў ідэям будучай дэмакратыі. Вядома, Валерыю Брусаву, паэту, выхаванаму буржуазным асяроддзем, не заўсёды ўдавалася поўнасцю пераадолець сваю класавую абмежаванасць. Яго літаратурныя, эстэтычныя густы перашкаджалі яму поўнасцю разгарнуць тэмперамент грамадскага дзеяча і палітычнага барацьбіта, але ўсё-ж тая паэзія, якую ён заняў яшчэ ў перадкастрычніцкую эпоху, сведчыць аб свядома выбраным няўхільным шляху, што і прывёў яго ў рады гарачых абаронцаў пролетарскай рэволюцыі, змагароў за мастацтва, якое служыла інтарэсам народа.

Паказальна, што нават у пару сваёй літаратурнай маладосці В. Брусаў першы, следам за Некрасавым і паэтамі-дэмакратамі XIX стагоддзя, сцвердзіў у паэзіі тэму горада. Пачуццё сапраўднага гістарызма дало яму магчымасць жыва адгукнуцца на падзеі руска-японскай вайны і рэволюцыі 1905 года.

Гэты бурны для нашай Радзімы час вызначыў і погляды В. Брусава на ролю паэта ў грамадстве, зблізіў яго творчыя пазіцыі з лепшымі запаветамі нашай класічнай паэзіі, абвешчанымі Пушкіным, Некрасавым, Белінскім.

Нямала можна знайсці ў В. Брусава вершаў, якія дыхаюць грамадзянскім пафасам пушкінскай і некрасаўскай паэзіі. Гэта з асаблівай яснасцю праявілася ў апошнія гады яго творчасці, пры савецкай уладзе. Такія вершы, як «Комунарам», «Савецкая Масква», «Чырвоны сцяг», «Над картай Еўропы 1922 года», сведчаць аб тым, што паэт заўсёды быў гатовы горача адгукнуцца на актуальныя праблемы сучаснасці.

В. Брусава з поўным правам можна было-б назваць паэтам гісторыі. Высокая культура, велізарная эрудыцыя, веданне многіх моваў дапамагалі яму глыбока пранікаць у глыб вякоў, ствараць яркія і запамінальныя партрэты людзей мінулых эпох. Назаўсёды застануцца ў рускай паэзіі нібы адлітыя з бронзы вобразы ўсходняга дэспата Асаргадона, бязлітаснага заваёўніка Александра Вялікага, разумнага і хітрага палітыка Юлія Цэзара і побач з імі — рымскіх рабоў, вандруючых грэчаскіх мудрацоў і натхнёных гуманістаў сярэдневякоўя.

Абвостранае пачуццё мінулага няўхільна вяло В. Брусава, як мастака, да разумення самых жывых, актуальных праблем сучаснага яму жыцця. Яго вершы апошніх гадоў, напісаныя ўжо з пазіцый паэта-комуніста, стракацяць гістарычнымі імёнамі і аналогіямі. Пэўная абмежаванасць навуковых поглядаў параджала ў паэта схільнасць да «гераічнай асобы», але гэта не перашкодзіла яму правільна разумець суадносіны асобы і народных мас. Ствараючы вобраз Леніна, паэт падкрэслівае, што Ленін — перш за ўсё вылучаны самім народам правадыр, «воль мільённых увасабленне», і разам з тым побач з вобразам правадыра ў Брусава нязменна ўзнікае вобраз працоўнага народа, натхнёнага пераўтваральніка гісторыі і прыроды роднай краіны.

Брусаў, паэт-грамадзянін, аддаў нямала ўвагі выяўленню рускага нацыянальнага характару, роднай яму рускай прыроды («Роднае», «Замлавальныя словы», «Вясной»). Пейзаж ён успрыймае амаль заўсёды на фоне роздуму аб гістарычным лёсе Радзімы, аб непазбежных зменах, якія прыносіць індустрыя савецкай эпохі. У савецкай паэзіі В. Брусаў, бадай, першы супаставіў прывычныя вобразы палёў, рачных затокаў з гудкамі заводаў, з электраплугам з шумам прапелера. Для яго гэта была арганічная сувязь з'яў, сапраўдная гістарычная заканамернасць.

В. Брусаву, як паэту, хацелася сустрэць новую эпоху чалавецтва сцверджаннем новых магчымасцей паэзіі, галоўны змест якой ён бачыў ва ўслаўленні саюза працы і навукі. Адзіна правільным метадам ён прызнаў шлях рэалістычнай паэзіі. Адмятаючы антынародныя плыні мадэрнізма, В. Брусаў поўнасцю прыняў соцыяльную праўду творчасці Маякоўскага яшчэ ў тыя часы, калі самому паэту-рэволюцыянеру даводзілася ў жорсткай барацьбе адстайваць свае паэтычныя правы. Неаднаразова — і ў артыкулах, і ў публічных выступленнях — В. Брусаў вызначаў будучае развіццё савецкай паэзіі, як магутны рух у бок мастацтва, якое будзе выяўляць пачуцці і думкі працоўнага класа. У 1921 г. ён пісаў: «Нашы дні правільней за ўсё называць эпохай творчасці. Паэзія мінулых перыядаў, эпох самаўладства, ведала толькі пафас пратэсту або пафас адасаблення і роздумаў; цяпер паэты павінны паказаць «новы пафас творчасці» («Сэнс сучаснай паэзіі»). Гэты «новы пафас» паэт бачыў у арганічным спалучэнні найбольш блізкіх яму тэм: Радзімы, Народа, Рэволюцыі.

А. М. Горкі назваў Брусава «культурнейшым паэтам нашай эпохі». Гэта сапраўды быў паэт-вучоны, які марыў аб стварэнні новага паэтычнага жанра, «навуковай паэзіі». Найвялікшая павага да ведаў і вера ў творчыя магчымасці чалавека ў многім збліжае літаратурную дзейнасць Брусава з той велізарнай работай па насаджэнню новай савецкай культуры, якой з такім захапленнем аддаваўся А. М. Горкі. Адсюль тое ўзаемаразуменне і павага, з якімі яны ставіліся адзін да другога.

Дзейнасць В. Брусава незвычайна рознастайная. Ён быў не толькі цудоўным паэтам, майстрам класічнага рускага верша, дакладным і натхнёным перакладчыкам, але і выдатным гісторыкам, археолагам, тэкстолагам Пушкіна, знаўцам мастацтва, палымяным грамадскім дзеячом. Ім заснаваны Літаратурны інстытут пры ССП СССР. Ён быў ініцыятарам збліжэння літаратур брацкіх народаў, упершыню апублікаваў на рускай мове ў сваім перакладзе творы класіка латышскай літаратуры Яна Райніса і стварыў першую анталогію «Паэзія Арменіі». Яшчэ ў 20-х гадах ён быў удастоены ганаровага звання «Народнага паэта Армянскай ССР».

В. Брусаў пісаў не толькі вершы, але артыкулы і навуковыя даследаванні па самых рознастайных пытаннях мастацтва. Яму належаць манаграфіі аб творчасці Тютчэва, Эміля Верхарна, аб паэтах Францыі. Шматлікія пераклады В. Брусава яшчэ ў дарэволюцыйныя часы знаёмілі рускага чытача з выдатнымі творамі класікаў прагрэсіўнай заходняй літаратуры. Напісаная ім кніга аб рускіх класічных паэтах XIX стагоддзя з'яўляецца ўзорам трапных і яркіх партрэтных характарыстык, якія не страцілі значэння і ў нашы дні.

В. Брусаву належаць адны з першых перакладаў вершаў Янкі Купалы на рускую мову. Жыва цікавячыся творчасцю класіка беларускай паэзіі, ён бачыў у ім цудоўнага майстра простай і дакладнай паэтычнай мовы, арганічна звязанай з вытокамі народнай песні, з багатай спадчынай шматвяковага народнага мастацтва.

В. Брусаў, несумненна, ёсць адна з самых цікавых з'яў рускай паэзіі. Само яго літаратурнае жыццё — яскравая старонка нашага літаратурнага мінулага.

Усевалад РАЖДЗЕСТВЕНСКІ.

Пяцігоддзе Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі

* * *

Шлях да міру і еднасці

Мікола САДКОВІЧ

Ёсць такія палітычныя падзеі, значэнне якіх найбольш поўна можна ацаніць толькі тады, калі раскрыюцца іх гістарычныя вынікі.

Пяць гадоў прайшло з таго дня, калі адбылася падзея, справядліва названая «паваротным пунктам у гісторыі Еўропы».

Пяць гадоў таму назад была ўтворана міралюбная Германская Дэмакратычная Рэспубліка.

Абвяшчэнне Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі з'явілася адказам германскага народа, яго растучых дэмакратычных сіл на раскольніцкую палітыку англа-амерыканскіх заправіл, якія імкнуліся ператварыць усю Германію і ператварылі яе заходнюю частку ў вотчыну амерыканскага імперыялізма, у стратэгічны плацдарм, накіраваны супраць Совецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі.

Новыя, сяброўскія адносіны паміж Германскай Дэмакратычнай Рэспублікай і народамі суседніх дэмакратычных дзяржаў не маглі не выклікаць злосную рэакцыю ворагаў свабоды і міру.

Тысячы рознастайнейшых правакацый, сотні дыверсійных актаў, паток іржавых артыкулаў, кінофільмаў, радыёперадач на працягу пяці гадоў мутнай хваляй коцяцца з Захаду да граніц маладой рэспублікі. Спробы падарваць эканоміку, сарваць ці хаця-б затармазіць рост народнага добрабыту, атруціць людзей чадам падрыхтоўкі новай вайны не спыняліся ні на адзін дзень. Не спыняюцца яны і цяпер, у дні, калі нямецкі народ, а разам з ім і ўсе сумленныя людзі свету адзначаюць перамоту лагера дэмакратыі — пяцігоддзе міралюбнай рэспублікі.

Можна не сумявацца, што і ў гэтыя дні, як гэта было пяць гадоў таму назад, як гэта было кожны год у дні народных свят, англа-амерыканская паліцыя і агенты Адэнауэра будуць хапаць і кідаць у турэмныя аўтамабілі тых, хто захоча на Захадзе далучыць свой голас да голасу мільёнаў свабодных немцаў Усходу.

Няма патрэбы гадаць, што яшчэ могуць выдумаць майстры падпалаў і правакацый. Іх прыёмы добра вядомыя і вывучаныя. Нам давялося пазнаёміцца з імі ў гістарычныя для Германіі і ўсёй Еўропы дні, калі працоўныя Германіі горача віталі свой першы дэмакратычны ўрад, выбранне свайго «рабочага Прэзідэнта» (так з любоўю называюць нямецкія рабочыя Вільгельма Піка). Нам давялося быць сведкамі амерыкана-адэнауэраўскіх правакацый і пазней, калі нямецкі народ абараняў і самаддана дапамагаў свайму ўраду ажыццявіць артыкулы новай свабоднай канстытуцыі. І мы з радасцю пераконваліся ў тым, што народ маладой дэмакратычнай рэспублікі заўсёды аказваўся на многа мацней, чым узброеныя да зубоў, дзесяцігоддзямі трэніраваныя правакатары і дыверсанты.

Так будзе і на гэты раз! Так будзе таму, што пяць гадоў пражыты сумленнымі немцамі ў сумеснай барацьбе за справу міру і ў дружбе з усімі, хто стаіць за мір, за справядлівасць, за дэмакратыю. Таму, што германскі народ не адзінокі ў сваёй барацьбе, таму што з першых дзён свайго існавання маладая рэспубліка сустрэла вялікае спачуванне і падтрымку ўсіх народаў свету і, у першую чаргу, народаў Совецкага Саюза.

Совецкі народ, які перажыў гады жорсткіх выпрабаванняў, які страціў многіх сыноў у барацьбе з гітлераўскімі захопнікамі, здолеў аддзяліць справядлівае пачуццё нянавісці да сапраўдных віноўнікаў няшчасця ад пачуцця брацкіх клопатаў аб ашуканым і ўвергнутым у крывавую авантуру працоўным чалавеку Германіі.

Вялікі і цудоўны такі народ! Цудоўная сіла яго вялікадушнасці, сіла пераможцы, які не толькі адмовіўся ад помсты, але стаў на абарону пераможанага.

Поспехі маладой Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі радуюць кожнага сумленнага чалавека.

Пяць гадоў — тэрмін невялікі. Але тое, што зроблена за гэтыя пяць гадоў, на сіле свайго ўплыву на жыццё краіны, на гісторыю народа, больш за многія раней пражытыя немцамі дзесяцігоддзі. Закладзены трывалы падмурак новай міралюбнай дэмакратычнай Германіі.

Гэты падмурак быў закладзены сёмага кастрычніка 1949 года.

Яшчэ за некалькі дзён да таго, як нямецкі Народны Совет ператварыўся ў Часовую Народную Палату, на вуліцах Берліна пачалі з'яўляцца шматлікія дэлегацыі, якія прыязджалі з розных гарадоў. Другога кастрычніка (у першую нядзелю гэтага месяца) у Германіі, як заўсёды, святкаваўся Дзень ураджаю. У 1949 годзе святкаванне Дня ўраджаю ператварылася ў дэманстрацыю дэмакратычных сіл. У сёлах і гарадах усходняй і заходняй часткі Германіі, на мітынгах, што стыхійна ўзнікалі, прымаліся рэзалюцыі, якія патрабавалі ўтварэння дэмакратычнай рэспублікі і пратэставалі супраць сепаратнага бонскага «ўрада».

— Не Бон, а Берлін! Няхай жыве Германская Дэмакратычная Рэспубліка! — было напісана на плакатах дэлегацый рабочых і сялян. З кожным днём у Берлін прыбывала ўсё больш і больш паслянцоў ад сялян Мэкленбурга, ад гарнякоў Саксоніі, ад рабочых Тюрынгіі. Хутка шырокая плошча перад будынкам Народнага Совета была ўся запоўнена. Так было і чацвёртага, і пятага, і шостага кастрычніка. Людзі не разыходзіліся. Яны гаварылі гарачыя прамовы, спрачаліся, выкрывалі падасланых з заходняга сектара Берліна адэнауэраўскіх правакатараў.

Спяваліся песні, выкрыкваліся заклікі. Берлін, які звычайна заціхае ў дзесяцідзінаццаць гадзін вечара, у гэтыя дні шумеў круглыя суткі. А калі сёмага кастрычніка было абвешчана рашэнне Часовай Народнай Палаты, горад напоўніўся радаснымі воклічамі, гукамі фанфар, песнямі і музыкай соцень аркестраў.

Два гады таму назад Мінск наведала дэлегацыя маладых рабочых-будаўнікоў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

На здымку: нямецкая дэлегацыя аглядае Комсамольскую вуліцу ў Мінску.

Фото **В. Лупейкі.** (Фотахроніка БЕЛТА).

Пачалася ўсеагульная дэманстрацыя. Працоўныя Германіі выказвалі сваю ўдзячнасць тым, хто прывёў іх да гэтага шчаслівага дня. Над гарадамі і сёламі Усходняй Германіі ўзняліся тысячы рознакаляровых флагаў, сцягоў. Кветкі, транспаранты, заклікі ўпрыгожылі будынкі, якія яшчэ захоўвалі сляды жорсткіх баёў. Пад бурным нацёскам усенароднага свята, здавалася, адступілі, зніклі з вачэй шэрыя кучы руін, гмахі спаленых дамоў. Усё зяяла фарбамі, звінела баявымі рэволюцыйнымі песнямі. Так было пяць гадоў таму назад.

Няцяжка ўявіць сабе, як сёння адзначае гэты дзень свайго слаўнага пяцігоддзя маладая рэспубліка.

Сёння сцягі і заклікі ўзняты не над старымі напоўразбуранымі дамамі, а над новымі будынкамі, пабудаванымі рукамі рабочых, якія пазналі свабодную працу, будаўнікамі новай Германіі!

Сёння небывала ўпрыгожылася адна з самых вялікіх і самых прыгожых вуліц Берліна — алея Сталіна. Некалькі гадоў таму назад мне давялося прысутнічаць на закладзінах першага дома на гэтай алеі, якая тады амаль не існавала. Гледзячы на першы камень, закладзены обер-бургамістрам Берліна, на першую светлую цаглі-ну сярод напалавіну абваленых, задымленых пажарамі сцен, цяжка было паверыць, што сёння з'явіцца перад намі светлая святочная алея Сталіна, на якой ужо нельга заўважыць ніякіх слядоў вайны. Усюды вынікі самаадданай працы — будынкі з малюнкамі белага голуба — сімвала міру.

Такім мы бачым сёння ўвесь дэмакратычны сектар Берліна.

Але варта пераступіць мяжу, якая падзяляе горад на сектары, як мы трапляем у іншы Берлін, у іншую Германію і ў іншы свет.

Сектары Берліна не абгароджаны калючым дротам, на іх межах адсутнічаюць патрульныя пасты. Не заўсёды нават можна заўважыць грозны плакат: «Вы ўязджаеце ў амерыканскі сектар». Але цяпер, як і раней, досыць глянуць на шыльды і рэкламы гандлёвых дамоў ці кінотэатраў, як вы зразумееце, куды трапілі.

З усіх бакоў вас апаноўвае рэклама чалавеканенавісніцкіх і парнаграфічных твораў амерыканскай «культуры».

Вас непрыемна здзіўляюць шырокавяшчальныя абвесткі аб праве кожнага чужаземца ўзяць на пракат «таксі-герлс».

На кожным кроку вы будзеце сустракацца з натоўпамі беспрацоўных. Тут нічога не будуецца, не аднаўляецца, акрамя пабітых, абанкрочаных, напалавіну і цалкам фашысцкіх арганізацый.

Тут усё прыстасоўваецца. Прыстасоўваецца да амерыканскага ладу жыцця. Прыстасоўваецца напоўразбураны будынак пад кантору прыватнай нямецкай фірмы з амерыканскай назвай.

Прыстасоўваецца адэнауэраўскі паліцэйскі, імкнучыся ва ўсім быць падобным на «малайцоў» у белых касках і з белай павязкай на рукаве — «МР» («Мілітэр паліцай»).

Прыстасоўваецца бонскі ўрад, ці як называюць яго сярод германскіх рабочых, «бонскае кабарэ». Прыстасоўваецца і сам гаспадар кабарэ — Адэнауэр. Толькі-б не зрабіць лішняга руху, не парушыць механізма, заведзенага ў Вашынгтоне.

Памятаецца, у дні ўтварэння Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі на плошчы аднаго з гарадоў Тюрынгіі ставіл святочны вясёлы спектакль сіламі Саюза свабоднай нямецкай моладзі. На невялікай эстрадзе, зробленай з двух аўтамабільных пляцовак, стаяў рослы дзяцюк у касцюме амерыканскага афіцэра з сігарэтай у зубах. Побач з ім маленькі, падобны на малпу, апрануты ў лакейскі фрак чалавек-лялька.

Чалавек-лялька не рабіў ні аднаго самастойнага руху. Добра натрэніраваны акцёр настолькі дакладна імітаваў рухі механічнай лялькі, што міжволі верылася, быццам пад фракам і маскай не жывое чалавечае цела, а лахманы і шарніры. Амерыканец націскаў пальцам нейкую кнопку на плячы лялькі, і прыходзілі ў рух рукі, націскаў другую — лялька пераступала нагамі. Яе можна было круціць, згінаць, кідаць на падлогу. Лялька бездамоўна выконвала ўсё. Толькі не гаварыла. За яе гаварыў усё той-жа амерыканец. Прарабіўшы рад забаўных рухаў і прытушыўшы сігарэту аб цыліндр лялькі, афіцэр звярнуўся з пытаннем да гледачоў, што абкружалі эстраду:

— Як назваць мне маю ляльку?

— А-дэ-на-уэр! — не вагаючыся, са смехам адказалі гледачы.

Людзі высмейвалі таго, хто прадаў нацыянальныя інтарэсы Германіі і, стаўшы паслухмянай марыянеткай амерыканскіх гаспадароў, рыхтуе ў сваім «бонскім кабарэ» зусім не жартоўныя паказы.

Гэта было ясна з самага пачатку. Гэта робіцца ясным цяпер і для тых, хто, жывучы на Захадзе Германіі, усё яшчэ думае, што адраджэнне радзімы і ўстанаўленне міру можа адбыцца з дапамогаю «заакіянскіх сяброў».

Аднастайныя рухі злоснай лялькі з Бона пачалі стамляць гледачоў. Усё больш простых людзей Захаду думаюць аб перамене месца пражывання. Імкнуцца на Усход, — у сваю міралюбную дэмакратычную рэспубліку!

У дні ўсенародных святкаванняў яны прабіраюцца праз занальныя межы. Прыходзяць пехатой, прыязджаюць на веласіпедах толькі дзеля таго, каб падыхаць свежым паветрам свабоднай Германіі, каб разам са сваімі шчаслівымі братамі прайсці па святочна ўпрыгожаных вуліцах і, не баючыся паліцэйскай дубінкі, на ўвесь голас праспяваць Гімн Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Ты айчыны спадзяванні
Здзейсніш, моладзь, верым мы!
Новы дзень у сонца зяянні
Над Германіяй ўстае.
Чэзнуць сілы цьмы.

У гэтыя дні госці з Заходняй Германіі ўбачаць яркі доказ таго, што задачы, якія стаяць перад маладой рэспублікай і яе першым дэмакратычным урадам, паспяхова выконваюцца. Што дружба і давер'е ўсяго прагрэсіўнага свету, у адносінах да свабоднай міралюбнай Германіі, растуць і мацнеюць. Што без дапамогі амерыканскіх маршалаў і іх кабальных дагавораў дэмакратычная рэспубліка аднавіла эканоміку ўсяго Усходу Германіі і невымерна ўзняла жыццёвы ўзровень насельніцтва. Што тут, у дэмакратычнай рэспубліцы, залог міру і аснова аб'еднання ўсёй Германіі, як адзінай міралюбнай дэмакратычнай дзяржавы.

* *

Вершы нямецкіх паэтаў

Іаганес Р. БЕХЕР

Песня пра блакітны сцяг

Моладзь нашая імкнецца
Уперад, крок чуваць калон.
Сцяг блакітны ў небе ўецца,
На Берлін спяшае ён.

Левай, левай! Хутка, спрытна
Крок друкуйце малады.
Пранясем мы сцяг блакітны
Цераз буры і гады.

Сцяг блакітны дружбы, брацтва.
Песні пець пра гэты сцяг.
Мы — Германіі юнацтва,
З намі мір ў адных радах.

Міру моц, табе скарыцца
Мусяць сэрцы ўсіх людзей.
Сцяг блакітны будзе віцца
У вышыні яшчэ вышэй.

Асвятліла нам раздольны
Сонца родны наш прасцяг.
Кожны з нас сягоння вольны,
Крочым мы, над намі сцяг.

Будаваць Айчыну трэба,
Трэба нам рады еднаць.
Будзе сцяг блакітны ў небе
Над Германіяй лунаць.

*) Блакітны сцяг — сцяг нямецкай дэмакратычнай моладзі.

Дзякуй вам, совецкія салдаты!

Вы сцяг перамогі крылаты
Узнеслі, з нас ёрмы знялі,
Краіны Советаў салдаты,
Героі совецкай зямлі.
Вам шчырае дзякуй, салдаты,
Героі совецкай зямлі.

Працоўны, ты ўсім, што здабыта,
Усім добрым, што мы здабылі,
Крыві абавязан, пралітай
Сынамі совецкай зямлі.
Крыві не забудзь ты, пралітай
Сынамі совецкай зямлі.

Над светам святла колькі льецца,
Каб людзі ўсе ў шчасці жылі,
Крывёю сыходзіла сэрца
Вялікай совецкай зямлі.
За лёс твой сыходзіла сэрца
Вялікай совецкай зямлі.

Нам зорамі шлях асвятліла,
І песні ў прастор паплылі:
Дарогі да шчасця адкрыла
Змаганне совецкай зямлі,
Дарогі да міру адкрыла
Змаганне совецкай зямлі.

КУБА

Тэльман

Краю мой, выпрастай плечы,
Благаславі гэты час.
Горды і шырокаплечы,
Зноў ён стаіць паміж нас.

Цяжкі свой пост не пакінуў.
Нацыі голас і чэсць —
Тэльман жыве, не загінуў,
З намі заўсёды, увесь.

І катавані і краты
Зведаў ён — колькі пакут!
Мужным змаганнем узняты,
Родны змагаецца люд.

К долі імкніся дастойнай,
К міру навек, назаўжды.
Путы сарві свае, вольна
Рэйн заплюскоча тады.

Вольна, бо хціўцаў ён скіне.
Ганьбу, айчына, забудзь.
Тэльман жыве, не загіне.
Гэткай, як Тэльман, ты будзь!

Стэфан ХЕРМЛІН

На мірным шляху

Мы толькі яшчэ пачынаем.
Які-ж будзе заўтрашні дзень! —
Духмяны, як кветкі мая,
Яскравы, як сонца прамень.

Расцем, сталеем няспынна
І гмахі ўздымаем будоў,
Дарогаю крочым мірнай
Між вольных народаў-сяброў.

Нас вывеў са змроку,
Няволі зняў груз
Вялікі магутны
Совецкі Саюз.

Дні працы ў цудоўным
Праменні ўстаюць.
Вітанне Варшава
І Прага нам шлюць.

Хто даль азарыў там
І веснюю рунь?
Шэсцьсот мільёнаў
І Мао Цзэ-дун.

Належыць народу
Наш край назусім.
Ворагу ў рукі
Свой лёс не дадзім.

Глядзіце, як крочаць,
У будучнасць з верай
Службоўцы, рабочыя,
Дзяды, піонеры.

Стала, сябры, як пер'е
Голуба, светлаю доля...
Той, хто на мірнай дарозе,
З яе не зверне ніколі.

Пераклаў з нямецкай мовы
А. Зарыцкі.

У Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы

ПОСПЕХ РЭАЛІСТЫЧНАГА МАСТАЦТВА

Каляровы фільм «Эрнст Тэльман — сын свайго класа» вытворчасці студыі «Дэфафарбфільм» заслужана лічыцца шэдэўрам рэалістычнага мастацтва. У фільме адлюстраваны жыццё і барацьба Эрнста Тэльмана ў перыяд з 1918 па 1923 год. Сцэнарысты—лаўрэат Нацыянальнай прэміі Віл Брэдэль і Міхаэл Часно-Хэл, пастаноўшчык лаўрэат Нацыянальнай прэміі Курт Метцыг стварылі жывы пераканаўчы вобраз правадыра нямецкага народа. Другая частка гэтага фільма выходзіць на экран пад назвай «Эрнст Тэльман — правадыр свайго класа». Ролю Тэльмана, як і ў першай серыі, выконвае малады артыст Гюнтэр Сімон.

ДОМ КУЛЬТУРЫ ІМЯ МАКСІМА ГОРКАГА

Ва ўсіх гарадах Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі арганізаваны клубы Таварыства германа - совецкай дружбы. Лепшым з такіх клубаў з'яўляецца Дом культуры імя Максіма Горкага ў горадзе Шверыне. Сюды прыходзяць усе, хто хоча азнаёміцца з багатай скарбніцай совецкай культуры. Часта наладжваюцца канцэрты, выстаўкі, абмен думкамі з совецкімі сябрамі. Тут багаты выбар мастацкай совецкай літаратуры (12.000 тамоў). Працуюць рознастайныя гурткі мастацкай самадзейнасці.

У ТЭАТРЫ ЛЯЛЕК

Тэатр лялек мае ў Германіі стогадовую традыцыю. Цяпер у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы ёсць некалькі тэатраў лялек.

Пасля сустрэчы з Сергеем Образцовым, які наведаў Германію ў 1950 годзе, у гэтых тэатрах пачалося новае жыццё. Тэатры лялек становяцца сапраўдным народным мастацтвам. Для сваіх пастановак яны апрацоўваюць народныя паданні і казкі. Адначасова там аднавіліся пастаноўкі карнавальных камедый Ганса Сакса. Нямала напісана і пастаўлена ў гэтых тэатрах камедыйных сучасных п'ес.

РАСЦЕ ЛІК СТУДЭНТАЎ

Расце лік студэнтаў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Толькі ў 1954 годзе тут у 48 універсітэтах займаецца 20 тысяч чалавек. Пераважная большасць студэнтаў забяспечваецца стыпендыяй. Павышаць свае веды, атрымаць усебаковую навуковую адукацыю — такім імкненнем жыве моладзь Усходняй дэмакратычнай Германіі.

«ЧАРОЎНАЯ ФЛЕЙТА»

Гледачамі Берліна горача сустрэта пастаноўка «Чароўнай флейты» — апошняй оперы Моцарта. Яна ідзе ў новай інсцэніроўцы пад кіраўніцтвам лаўрэата нацыянальнай прэміі Вальтэра Фельзенштэйна ў тэатры Камедыйнай оперы. Салістамі ў гэтай оперы выступаюць выдатныя германскія артысты, якія прыбываюць на гастролі з розных гарадоў рэспублікі.

НОВЫ ТЭАТР

У Берліне на Люксембургплацы адбудаваны і зноў адкрыты тэатр «Народнай сцэны». Гэта самы папулярны тэатр сярод берлінскіх рабочых. У тэатры 1.170 месц. Сцэна абсталявана па апошняму слову сучаснай тэхнікі.

У дзень адкрыцця гэты тэатр паказаў новую інсцэніроўку п'есы Шылера «Вільгельм Тэль». У рэпертуары тэатра: «Утаймаванне непакорнай» і «Сон у летнюю ночь» Шэкспіра, п'есы Нестроя, Каліша, Гласбрэнера, а таксама інсцэніроўка «Анны Карэнінай» Талстога, п'есы «Тры сястры» Чэхава, «Перад Захадам» Гергарда Гаўптмана і г. д.

Новыя самадзейныя калектывы

У Клецкім раёне пры сельскіх клубах, хатах-чытальнях створаны гурткі мастацкай самадзейнасці.

Хор у вёсцы Морач арганізаваны год таму назад. За гэты час хор выязджаў з канцэртамі ў Заастравечча, Нагорнае, Стараселле, Межную Слабаду, соўгас «Чырвоная звязда». Некалькі разоў ён выступаў у раённым Доме культуры, у Клецкім гарадскім парку і заслужыў пахвалу гледачоў.

Акрамя харавых і танцавальных калектываў, у раёне налічваецца каля 20 драматычных гурткоў. Многія з іх актыўна працуюць над новымі творамі совецкіх драматургаў. Асаблівай увагай у Клецкім раёне карыстаецца драматычны калектыў пры клубе калгаса імя Жданава. Да агляду мастацкай самадзейнасці драмгурток рыхтуе п'есу Я. Купалы «Паўлінка».

Ул. ДЗІКЕВІЧ.

Клецкі раён.

Прапаганда прыродазнаўча-навуковых ведаў

Аддзел агітацыі і прапаганды Шарашоўскага райкома партыі (Брэсцкая вобласць) арганізаваў чытку лекцый на прыродазнаўча-навуковыя тэмы.

У сельскім клубе вёскі Вялікае Сяло для членаў калгаса «Першае мая» была прачытана лекцыя «Марксізм-ленінізм аб рэлігіі». На лекцыі прысутнічала больш ста калгаснікаў. Лектару тав. Кірыліну было зададзена многа пытанняў. Пасля лекцыі прысутныя глядзелі кінофільм.

У вёсцы Шарчова калгаснікі сельгасарцелі імя Маленкова з вялікай цікавасцю праслухалі лекцыю на тэму «Ці быў пачатак і ці будзе канец свету?», а ў вёсцы Стараволя была прачытана лекцыя «Ватыкан — злейшы вораг сацыялізма і дэмакратыі».

Я. РОЗБАШ.

„Рэлігія—вораг навукі"

На такую тэму адкрыта літаратурная выстаўка ў чытальнай зале Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага. Вялікае месца на выстаўцы займаюць асобныя працы і выказванні класікаў марксізма-ленінізма аб рэлігіі. Побач з навуковымі працамі совецкіх вучоных тут знаходзяцца шматлікія творы М. Горкага, В. Маякоўскага, А. Чэхава, Я. Коласа, К. Крапівы, П. Труса і іншых пісьменнікаў.

Па слядах нашых выступленняў

„Аб музычных інструментах і нотах"

Пад такім загалоўкам у нашай газеце ад 4 верасня г. г. надрукаваны допіс тав. Данцова аб адсутнасці музычнай літаратуры ў магазінах г. Гродна і вобласці.

Як паведамляе ў рэдакцыю начальнік Галоўкнігагандлю тав. Ляноўскі, дадзена ўказанне папоўніць асартымент кніжных магазінаў вобласці музычнай літаратурай. Літаратура, якая адсутнічае на абласной базе, будзе завезена з рэспубліканскай кніжнай базы.

На кніжнай паліцы

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі:

А. П. Чэхаў. Выбраныя творы. Рэдактар перакладаў Янка Брыль. Мастак В. Басаў. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 588. Цана 9 руб. 80 кап.

Натан Рыбак. Пераяслаўская рада. Раман. Том І. Пераклаў з украінскай мовы Максім Лужанін. Рэдактар М. Лобан. Мастак Н. Шырокаў. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 524. Цена 12 руб.

Н. В. Гогаль. Тарас Бульба. Пераклад М. Паслядовіча і А. Бачылы. Рэдактар У. Карпаў. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 148. Цана 3 руб. 10 кап.

Аляксандр Скібнеўскі. Народны артыст СССР А. К. Ільінскі. Рэдактар Я. Рамановіч. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 68. Цана 1 руб. 95 кап.

Павел Кавалёў. Згублены дзённік. Апавяданні. Малюнкі П. Астроўскага. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 88. Цана 2 руб. 55 кап.

Янка Маўр. Цётка Эмілія. Апавяданне. Малюнкі В. Варанецкага. Вокладка Н. Гуціева. Тыраж 20 тыс. экз., стар. 48. Цана 65 кап.

Аляксандр Міронаў. Сын докера. Апавяданні. На рускай мове. Мастак Н. Гуціеў. Тыраж 20 тыс. экз., стар. 120. Цана 2 руб. 65 кап.

Нікалай Гарулёў. Сябры-таварышы. Аповесць. На рускай мове. Мастак Е. Змітровіч. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 232. Цана 3 руб. 50 кап.

Яўгені Юнга. Неўміручы карабель. Расказ аб Чырвонасцяжным крэйсеры «Аўрора». Малюнкі В. Варанецкага. Рэдактар С. Міхальчук. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 100. Цана 2 руб. 90 кап.

Галоўнае ўпраўленне па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці старэйшай артысткі Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Марыі Еўстаф'еўны СТРОЙСКАЙ і выказвае спачуванне калектыву тэатра.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Дзмітрый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намесніх галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Настусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Барыс ПЯРКОЎСКІ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 04490. Друкарня «Чырвоны друкар», Мінск, Рэволюцыйная, 12. 18